ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гарному Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 13 (4265)
Субота, 16 студзеня 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 83

Сёньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВАЯ — XIV зьезд КП(б)Б спаткаць рашаючай перамогай на фронце ільназагатовак (1 стар.). К. ГЕЙ — На шляху да новых дасягненьняў (2 стар.). Я. ІЛЬЛІНСКІ — Інтэрвэнцыя францускага імпэрыялізму ў Кітаі (2 стар.). І. ФЭЛЬДМАН — Пытаньні гаспадарчага разрахунку і банкаўскага крэдыту (3 стар.). СТРЭЛЕ — Калгасную вытворчасьць на вышэйшую ступень (3 стар.).

АГЛЯД ДРУКУ — Фіксатар і арганізатар. З апошняй пошты (3 стар.).

Аб правядзеньні ленінскіх дзён—пастанова Сакратарыяту ЦК КП(б)Б (1 стар.). Менскі раён павінен дабіцца выкананьня і перавыкананьня пляну збожжазагатовак. Завод «Полымя рэвалюцыі» абавязваецца забясьпечыць запаснымі часткамі абменныя пункты (1 стар.).

На раённых партканфэрэнцыях (2 стар.). Аб ходзе конкурсу нізавога друку — пастанова ЦК КП(б)Б (2 стар.).

Перамогамі на дровазагатоўках сустрэнем XIV зьезд КП(б)Б (3 стар.).

Бальшавіцкая прэса — арганізатар сацыялістычнага будаўніцтва (4 стар.).

Адкрыліся II менская партканфэрэнцыя і X партканфэрэнцыя БВА (4 ст.

XIV ЗЬЕЗД КП(б)Б СПАТКАЦЬ РАШАЮЧАЙ ПЕРАМОГАЙ НА ФРОНЦЕ ІЛЬНАЗАГАТОВАК

Падагульваючы вынікі ільназагатовак за апошнія кварталы мінулага году, мы знаходзім у іх яшчэ адно бліскучае пацьвярджэньне правільнасьці лініі партыі на разгортваньні буйных саўгасных і калгасных гаспадарак, як на адзіны шлях, які забясьпечвае хуткі росквіт сельскай гаспадаркі і ўзьняцьце яе таварнасьці на нязбывалую вышыню. Іменна дзякуючы атрыманым посьпехам у галіне рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, БССР на 6-та студзеня 1932 г. **загатовіла ільнавалакна амаль у тры разы больш**, чым у мінулым годзе па гэты-ж дзень (142.980 цэнт. супроць 46.340 цэнт.).

Гэты наглядны паказальнік пераваг буйнага сацыялістычнага земляробства сьвядчыць аб поўным банкрутстве «прароцтваў» апартуністычных элементаў, якія трымалі стаўку на капіталістычнае разьвіцьцё нашай сельскай гаспадаркі і, у прыватнасьці, на «моцных» (чытай, кулакоў) ільнаводаў.

Такавы неабвержныя паказальнікі вялікіх перамог, якія заваявала КП(б)Б, пад кіраўніцтвам яе ЦК у рашучай і пасьлядоўнай барацьбе з правым і «левым» апартунізмам і пры міроцтвам да іх.

Аднак, зусім відавочна, што ў арганізацыі ільназагатовак ацлізарныя пераваг сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі скарыстаны яшчэ ў зусім нязначнай меры. У гэтай адказнейшай і важнейшай кампаніі мы яўна адстаем ад тэмпаў, намечаных на чацьверты, заключны год пяцігодкі. Аб гэтым гаворыць той факт, што на 11-га студзеня па БССР, замест 90 проц. пляну загатовак ільнавалакна выканан толькі на 47,9 проц. Прычым, на працягу апошніх пяцідзевак ня толькі не наглядзецца нарастаньня тэмпаў, а наадварот,—тэмпы зьніжаюцца

Ільнаводная група раёнаў у цілым выкавала заданьне на 45,4 проц., а асобныя раёны, як Дубровенскі—толькі на 32,7 проц., Полацкі—на 32,4 проц., Асьвейскі—на 32,5 проц. і г. д.

Гэта наглядныя разультаты абураючага самацёку, які замяніў бальшавіцкую арганізацыю ільназагатовак у ганебна адстаючых раёнах, рэзультаты стаўкі асобных мясцовых арганізацый на чарговасьць кампаній (чакаюць сканчэньня збожжазагатовак, каб потым толькі ўзяцца за лён).

Вельмі павучальны вопыт перадавых раёнаў. Гомельскі раён выканаў заданьне па ільнавалакне на 90,3 проц., Ветка ўскі на 82,8 проц., а Лоеўскі—на 110,4 проц. Збожжазагатоўкі, такім чынам, зусім не перашкаджалі адначасова на-бяльному арганізаваць ільназагатоўкі. У сьвятле гэтага апартуністычная сутнасьць самацёку і стаўкі на чарговасьць кампаній выпукляецца асабліва рэзка.

Палітычная недаацэнка ільназагатовак радам раённых арганізацый і ігнараваньне імі зусім выразных арганізацыйна-масавых мерапрыемстваў, вызначаных ЦК КП(б)Б і СНК БССР, прывяла да вялізарнага разрыву паміж ільнаапрацоўкай і загатоўкай ільнавалакна.

Фарсаваньне тэмпаў загатовак валакна ўпіраецца ў разгортваньне апрацоўкі ільну непасрэдна ў калгасах і вёсках. Між тым, далёка ня ўсюды гэта ўсьвядомлена. У Полацкім, Дубровенскім, Дрысенскім і радзе іншых раёнаў усё яшчэ пазуюць памылковыя надзеі на тое, што з гэтай задачай далжам справіцца ільназаводы. Шкодніцтвы такіх настрояў відавочна, бо сёлета мы яшчэ ня можам ахапіць увесь лён заводжай апрацоўкай.

Ня глядзячы на гэта, арганізацыі адстаючых раёнаў не забясьпечылі патрэбных тэмпаў ільнаапрацоўкі, як у калгасным, так і ў аднаасобным сэктары. Нават яшчэ ня ўсе ільнаапрацоўчыя пункты працуюць, а прэміяльная зьдзельшчына на справе ўжываецца вельмі рэдка. Належныя меры да правільнай арганізацыі працы на цэхах, да рацыянальнага скарыстаньня машын у многіх мясцох ня прыняты.

З такім становішчам трэба неадкладна пакончыць. Разгортваньне ільнаапрацоўкі павінна быць пастаўлена, як ударная задача раённых і нізавых арганізацый. Ні аднаго апрацоўчага пункту, ні аднэй сёўні, якая-б бязьдзейнічала, якая-б ня была пераведзена на кругла-сутачную рботу! Трэба забясьпечыць удзел у працы на пункце, у сёўні ўсіх працаздольных калгасьніц і калгасьнікаў, неадкладна ажыцьцявіць прагрэсыўную зьдзельшчыну. Сацыялістычны буксір, калгасная ўзаемадапамога, дапамога калгасаў аднаасобнікам і наадварот—павінны стаць магутнымі вагарамі фарсаваньня апрацоўкі і загатоўкі валакна.

Бязьдзейнасьць у арганізацыі апрацоўкі ільну ва многіх мясцох суправаджаецца адсутнасьцю разгорнутай масавай ра[illegible] вакол ільназагатовак, неразуменьнем таго, што выкананьне сваіх абавязкаў перад дзяржавай зьяўляецца адной з рашаючых умоў посьпяховага арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Такое становішча клясавы вораг ідэ-ці-ідэ не без посьпеху скарыстоўвае для распальваньня спажывецкіх тэндэнцый, для зрыву загатовак і мерапрыемстваў па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Калгас «Чырвоны баец № 2» (Бабруйскі раён), напрыклад, на здаўны дзяржаве ніводнага кілё валакна, увесь лён разьмеркаваў сярод сваіх членаў, частка калгасьнікаў арцелі «Пяцігодка», атрымаўшы лён, прадала яго на прыватны рынак.

Гэтыя рвацкія, кулацкія тэндэнцыі ня сустрэлі рашучага адпору ні з боку райкалгассаюзу, ні мясцовых арганізацый, што ня можа быць інакш расцэнена, як патураньне кулаку. Такая махровая апартуністычная практыка павінна быць выкарчавана з карэньнямі. Мабілізуючы клясныя масы на бальшавіцкае выкананьне пляну ільназагатовак і разгортваючы сыстэматычную выхаваўчую работу па зжываньні індывідуалістычных тэндэнцый у калгасах, трэба змагацца са спажывецкімі рэакцыкімі настроямі, арганізуючы жорсткі адпор кулаку і яго дапаможнікам.

Клясавы вораг вядзе актыўную работу, асабліва сярод аднаасобнікаў, за здачу нядобраякаснай прадукцыі. Гэтай шкодніцкай дзейнасьці спрыяе бюракратызм і бязьдзейнасьць загатоўчага апарату ў радзе месц. Неабходна дабіцца крутога пералому на гэтым важнейшым вучастку. Загатоўчы апарат абавязан неадкладна перабудаваць свае старыя мэтады работы, практычна (паказам, інструктажам) дапамагаючы калгасьнікам і аднаасобнікам павысіць якасьць ільнаапрацоўкі.

У апошні час асабліва рэзка выявілася адставаньне аднаасобнага сэктару. У той час, як калгасы выканалі сваё заданьне на 62,2 проц., аднаасобнікі толькі на 31,7%. Па паасобных раёнах становішча яшчэ горшае. Па Віцебскім раёне напрыклад, калкалгасьнікі далі 109% пляну, а аднаасобнікі—12,9 проц., па Гарадоцкім раёне—72 і 17 проц. і г. д. У валуасьці ў радзе калгасаў паўная ніводная аднаасобная сэктару ў ільназагатоўках. Гэта трэба неадкладна выправіць. Разгортваньне арганізацыйна - масавай работы сярод аднаасобнікаў зябесьпечыць рашучы пералом па гэтым вучастку.

Большасьць раёнаў яшчэ не спачала поўнасьцю цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможнай часткі вёскі, ня глядзячы на тое, што ўсе тэрміны ўжо даўно прайшлі. Далей такую практыку цярпець нельга. Трэба прымусіць кулака выканаць цьвёрдае заданьне ў бліжэйшыя-ж дні.

У апошній сваёй пастанове ЦК КП(б)Б стаіць перад раённымі парт-арганізацыямі баявую задачу—па прапягу дэкады дабіцца рашучага пералому на фронце ільназагатовак. Практыка перадавых раёнаў доводзіць калгасаў, якія ўжо ня толькі выканалі, але і перавыканалі плян здачы валакна, гаворыць аб поўнай магчымасьці ажыцьцявіць гэту задачу да XIV зьезду КП(б)Б. Пад знакам барацьбы за права рапартаваць партыйнаму зьезду рад раёнаў ужо здолеў мабілізаваць калгасьнікаў і аднаасобнікаў на ліквідацыю адставаньня ў загатоўках і дабіўся значных посьпехаў.

Пад гэтым лёзунгам павінны змагацца ўсе адстаючыя раёны, калгасы і вёскі, дабіваючыся рашаючага посьпеху ў загатоўках валакна, пянькі, капапель.

Завод „Полымя Рэвалюцыі“ абавязваецца забясьпечыць запаснымі часткамі абменныя пункты

Ударнікі заводу сустракаюць XIV зьезд КП(б)Б хваляй сустрэчных плянаў

Сустрэчныя трансфіпляны рабочых кавальскага цэху

Мы, рабочыя і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал кавальскага цэху вагона-рамонтнага **заводу «Полымя рэвалюцыі»** (Менск), на аснове пасьлядоўнага правядзеньня ў жыцьцё 6 гістарычных умоў тав. **Сталіна**, дабіліся значных посьпехаў у сваёй рабоце. На працягу месячніка рэалізацыі загаду **тав. Андрэева**, мы зьвіншчылі абязьлічку і ўраўніляўку. Кваліфікаваны рабочых павысілася. Мы ўнесьлі 50 рабочых прапаноў.

119 рабочых нашага цэху ахоплены ўдарніцтвам і соцспаборніцтвам.

Шляхам правядзеньня камуністычных мэтадаў работы — соцспаборніцтва і ўдарніцтва, прадукцыйнасьць працы значна ўзьнялася. Лепшыя ўдарнікі сыстэматычна выконваюць і перавыконваюць трамфіпляны. Вось імёны нашых лепшых ударнікаў: **машыніст** пароваго молату **Фідрых**, рабочых цэху — **Сьцефановіч, Корзюк, Шаглоў Іван, Фэльдман, Богапрыкец, Жыгалка, Гольдбэрг, Якуцін, Зьвёздачкін, Шакура, Плыгаўка, Самуйловіч, Елісеў і Барсуноў.**

Але побач з гэтым у нашым цэху ёсьць яшчэ значныя недахопы. Гаспадарчы разрахунак на сёнешні дзень яшчэ ня стаў асноўным сродкам барацьбы за ўнутрызаводзкае накапленьне, за павышэньне якасьці прадукцыі, эканомію матар'ялу, апалу і г. д. Мы маем яшчэ ў цэху гультаёў, прагульшчыкаў (**Яцушкевіч, Вэўкевіч, Лямпэрт, Вашкевіч** і інш.), якія ганьбуюць сваімі паводзінамі наш цэх.

У 4-м заключным годзе пяцігодкі перад нашым цэхам стаяць адказнейшыя задачы ў галіне своячасовага забясьпечэньня адпаведнай прадукцыяй і запаснымі часткамі зборачных цэхаў нашага заводу і абменных пунктаў усёй чыгункі МБК.

Трансфіпляны нашага цэху на 1932 год параўнальна з мінулым годам павялічаны на 100 проц. Але мы добра ведаем, што ў нас ёсьць усе магчымасьці ня толькі поўнасьцю выканаць гэты трансфіпляны, але і перавыканаць яго, а таму мы высоўваем свой сустрэчны: Гаспадарча-разрахунковая брыгада прэсавага аддзяленьня дае сустрэчны трансфіпляны па вырабе балтоў і заклёпак на 10 тон больш пляну, брыгада рэсоршчыкаў—таварных рэсор на 400 штук больш, элептычных рэсор — 36 штук і рэсор-падважных для клясных вагонаў — 60 штук; брыгада па станках на 1.250 штук, брыгада па бухтавых рамах — 400 штук, брыгада па рамонце сцяжак — 300 штук, брыгада па сьцержнях—1.500 шт., брыгада па рамонце сярожак — 4.000 шт., брыгада па рамонце крукаў — 300 шт.

Рабочыя электразварачнага аддзяленьня пры кавальскім цэху высунулі сустрэчны — утылізаваць усе нягодныя запасныя часткі вагонаў і выпрабаваць розныя дэталі на 20 проц. больш заданага.

Мы, рабочыя кавальскага цэху, запэўнаем ЦК КП(б)Б, што пад яго выпрабаваным кіраўніцтвам, узятыя на сябе канкрэтныя абавязацельствы ў 4-м завяршаючым годзе пяцігодкі з гонарам выканаем і перавыканаем.

Рабочыя кавальнага цэху заводу «Полымя рэвалюцыі».
(27 подпісаў).

Рэалізаваць самаабавязацельствы

Кантрольныя лічбы на 1932 год ставяць перад чыгуначным сацыялістычным транспартам надзвычай вялікія задачы.

Чыгуначны транспарт Саюзу ў чацьвертым, заключным годзе пяцігодкі павінен будзе перавезьці 320 млн. тон грузаў, што дае павялічэньне параўнальна з 1931 годам на 28 проц., а параўнальна з 1913 годам — амаль на 50 проц.

Для выкананьня гэтай баявой задачы чыгуначны транспарт на працягу гэтага году атрымлівае дадаткова 50.000 грузавых вагонаў, 1.300 паравозаў, 24 электравозы і 15 цепловозаў. Аднак, гэта папаўненьне параўнальна ніжэй росту перавозак. Таму чыгуначнікі БССР, як і чыгуначнікі ўсяго Саюзу, павінны з яшчэ большай упартасьцю змагацца за лепшае выкарыстаньне ўнутраных рэсурсаў і наяўнага рухомага складу.

Абменныя пункты, вагонна-рамонтныя майстэрні і вагонна-паравозныя рамонтныя заводы ў справе правільнага і своячасовага аздараўленьня вагоннага парку здыгрываюць важнейшую ролю.

У выразнай рабоце абменных пунктаў — зарука аздараўленьня вагоннага парку. Між тым, трэба адзначыць, што да гэтага часу абменныя пункты **Менску, Воршы, Магілева** і інш. доўга трымаюць вагоны ў рамонце і дрэнна рамонтуюць іх.

Поўнасьцю і своячасова забясьпечыць абменныя пункты запаснымі часткамі, палепшыць якасьць рамонту і зьнізіць да мінімуму тэрміны прастояў вагонаў у рамонце — неадкладная і баявая задача рабочых абменных пунктаў і рабочых, якія вырабляюць запасныя часткі для пунктаў.

Гэту задачу добра сабе ўяві[illegible] рабочыя вагонна-рамонтнага заводу **«Полымя рэвалюцыі»** (г. Менск). Ударнікі кавальскага цэху гэтага заводу ў адзнаку XIV зьезду КП(б)Б высунулі сустрэчны трамфіпляны на 1932 г. па вырабе запасных частак як для свайго заводу, так і для абменных пунктаў усёй МБК чыгункі. Яны абавязаліся на працягу году даць звыш пляну больш 10.000 розных дэталяй. Рад цэхаў высунулі сустрэчныя пляны па рамонце і г. д.

Задача зараз заключаецца ў тым, каб рабочыя заводу «Полымя рэвалюцыі» і ў першую чаргу рабочыя кавальскага цэху фарсавалі тэмпы рэалізацыі сваіх самаабавязацельстваў.

Па рабочых заводу «Полымя рэвалюцыі» павінны раўняцца рабочыя заводу імя Ланцуцкага і ўсіх абменных пунктаў БССР.

„Ні аднаго цэнтнэра збожжа—прыватніку“ (ЦК УсеКП(б)

МЕНСКІ РАЁН ПАВІНЕН ДАБІЦЦА ВЫКАНАНЬНЯ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК

Заваяваць права на рапарт XIV партзьезду

Менскі раён на 10 студзеня выканаў гадавы збожжазагатоўчы плян на 86,7 проц. Упередзе ідуць калгасы, якія далі 94,4 проц. заданьня, на другім месцы — аднаасобны сэктар — 82,5 проц. і на апошнім месцы — саўгасы, якія рэалізавалі сваё заданьне толькі на 68 проц.

Гэтыя лічбы сьведчаць аб тым, што тэмпы збожжазагатовак на Менскім раёне нездавальняючыя, прычым асабліва недапушчальная справа па саўгасах, якія замест таго, каб паказаць прыклад свалчасовай здачы збожжа дзяржаве, цягнуцца ў хвасьце.

Кулацка-заможныя элемэнты злосна сабатуюць збожжазагатоўкі, а паасобныя мясцовыя арганізацыі адносяцца да гэтага прымірэнча, ня прымаюць ніякіх мер, каб прымусіць кулака поўнасьцю і неадкладна выканаць цьвёрдыя заданьні. У выніку на 10 студзеня цьвёрдыя заданьні спагнаны ўсяго на 27,2 проц.

Крывая збожжазагатовак па раёне трымаецца на нізкім узроўні з тэй прычыны, што рад сельсаветаў ганебна адстаюць. Так, **Замастоцкі** сельсавет выканаў гадавое заданьне толькі на 43,5 проц., **Абчацкі**—на 46 проц., **Сеньніцкі** — на 70,1 проц., **Падгайскі** —71,4 проц. Гэта вынік невыстарчальнага апэрацыйнага кіраўніцтва з боку загатоўчых арганізацый і сельсаветаў, слабай арганізацыйна-масавай работы сярод калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў.

Гэтыя сельсаветы не падхапілі вопыту перадавых сельсаветаў, якія ўжо выканалі і перавыканалі свае заданьні. Так, **Чайкаўскі** сельсавет рэалізаваў збожжазагатоўчы плян на 125 проц., **Прыгарадны** — на 103,7 проц., **Калодзішчанскі** — на 101,2 проц.

10 студзеня пры Менгарсавеце адбылася шырокая нарада з удзелам усіх старшынь сельсаветаў па пытаньні аб збожжазагатоўках. **Нарада прыняла выклік уваравіцкіх калгасьнікаў і аднаасобнікаў і ўключылася ва ўсебеларускі конкурс на лепшае завяршэньне збожжазагатовак да XIV зьезду КП(б)Б.**

Для фарсаваньня збожжазагатовак гарсавет мабілізаваў 26 адказных работнікаў, якія выехалі ў калгасы і сельсаветы.

Гарадзкая партыйная канфэрэнцыя, якая зараз адбываецца, павінна аддаць асаблівую ўвагу пытаньню ходу збожжазагатовак і мабілізаваць усе сілы на паспяховае завяршэньне іх у бліжэйшыя-ж дні. **Менскі раён павінен заваяваць права на рапарт XIV зьезду КП(б)Б аб сканчэньні збожжавай кампаніі.**

Б. Д.

Ударнікі менскіх заводаў—на дапамогу збожжазагатоўкам

Гарбары і абутнікі Магілева, Віцебску і Гомелю, прымайце выклік „Бальшавіка“

МЕНСКІ ГАРАДЗКІ САВЕТ ПРАФСАЮЗАЎ І ГАРАДЗКІ ШЭФСКІ САВЕТ ЗЬВЯРНУЛІСЯ ДА ЎСІХ ФАБРЫЧНА-ЗАВОДЗКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ І ШЭФСКІХ ТАВАРЫСТВАЎ МЕНСКУ З ЗАКЛІКАМ УКЛЮЧЫЦЦА ПА-БАЯВОМУ У ДЭКАДНІК ШТУРМУ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК І ВА ЎСЕБЕЛАРУСКІ КОНКУРС, АБВЕШЧАНЫ «ЗЬВЯЗДОЙ» І НАРКАМСНАБАМ БССР. «ПА МЕНСКІМ РАЁНЕ ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК ЯШЧЭ ПОЎНАСЬЦЮ НЯ ВЫКАНАН—ГАВОРЫЦЦА Ў АДОЗЫВЕ.—РАБОЧЫЯ ШЭФСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ ПАВІННЫ САДЗЕЙНІЧАЦЬ ВЫРАШЭНЬНЮ БАЯВОЙ ЗАДАЧЫ, ДАПАМАГЧЫ МЯСЦОВЫМ АРГАНІЗАЦЫЯМ ВЫКАНАЦЬ ПОЎНАСЬЦЮ ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК. **КОЖНАЯ ШЭФСКАЯ ЯЧЭЙКА, АДКАЗВАЕ, ЯК ПАДШЭФНЫ СЕЛЬСАВЕТ ВЫКОНВАЕ ПЛЯН ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК, ПАВІННА БЫЦЬ ІНІЦЫЯТАРАМ АРГАНІЗАЦЫІ СУСТРЭЧНЫХ ПЛЯНАЎ.**

АСАБЛІВАЯ ЎВАГА ПАВІННА БЫЦЬ ЗЬВЕРНУТА НА СПАГНАНЬНЕ ЦВЁРДЫХ ЗАДАЧЭНЬНЯЎ ВЫРАШТАЧКА-ЗАМОЖНЫХ ГАСПАДАРАК. **БУДЗЕМ РАПАРТАВАЦЬ XIV ЗЬЕЗДУ КП(б)Б АБ ПОЎНЫМ СКАНЧЭНЬНІ ПЛЯНУ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК ПА МЕНСКІМ РАЁНЕ».**

***

ПЕРШАЙ УКЛЮЧЫЛАСЯ Ў КОНКУРС ШЭФСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ЧЫРВОНАСЬЦЯЖНАГА **«БАЛЬШАВІКА»**. ЯНА ПАСЛАЛА Ў ПАДШЭФНЫ СЕЛЬСАВЕТ СПЭЦЫЯЛЬНУЮ БРЫГАДУ З НАКАЗАЛ—ДАБІЦЦА НЕАДКЛАДНА ГА ПАВЫШЭНЬНЯ ТЭМПАЎ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК. ГЭТАЯ ПРАВОДЗІЦЦА ПАД ЛЁЗУНГАМ: «ЗМАГАЦЦА ЗА ПРАВА РАПАРТАВАЦЬ XIV ЗЬЕЗДУ КП(б)Б АБ ПОЎНЫМ ВЫКАНАНЬНІ ПЛЯНУ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК Ў ПАДШЭФНЫМ СЕЛЬСАВЕЦЕ».

ГАРБАРНЯ «БАЛЬШАВІК» ВЫКЛІКАЛА ПАСЬЛЕДАВАЦЬ ЯЕ ПРЫКЛАДУ МАГІЛЕЎСКУЮ ГАРБАРНЮ ІМЯ СТАЛІНА, ВІЦЕБСКУЮ, ГОМЕЛЬСКУЮ І МЕНСКУЮ АБУТКОВЫЯ ФАБРЫКІ.

ЗДАЧАЙ ЗБОЖЖА АДКАЗВАЮЦЬ НА АДОЗВУ УВАРАВІЦКІХ КАЛГАСЬНІКАЎ АДНААСОБНІКАЎ

ВІЦЕБСК.

Даўжанскі сельсавет, Віцебскага раёну, з посьпехам завяршыў збожжазагатоўчую кампанію. **Заданьне ў 105 тон збожжа выканана да 1-га студзеня на 100 проц.** Сельсавет мае пэўныя посьпехі і па другіх відах загатовак: заданьне па бульбе ў 365 тон перавыкананa—здана 388 тон; па мясе за троці і чацьверты кварталы плян рэалізован на 99 проц. Прычым (гэта вельмі важна) дробная жывёла складае каля 90 проц. зданай прадукцыі.

Па ільнавалакне—найбольш адсталым зьвяне загатоўчай работы ў сельсавеце—плян выкапан на **60 проц.**, ільпасемі—80 проц., што значна вышэй сярэдняга процанту па рэспубліцы.

Партыйная ячэйка і Даўжанскі сельсавет дабіліся бліскучых вынікаў і ў галіне мабілізацыі сродкаў. Плян выканан на 110 проц.

Гэтыя здавалася-б сухія лічбы, над звычай паказальныя. Яны, па-першае, яшчэ і яшчэ раз падкрэсьліваюць рэальнасьць нашых плянаў.

Яны па-другое, гавораць аб тым, што пры ўмелай рабоце і бальшавіцкай настойлівасьці можна ня толькі акуратна і ў тэрмін выконваць заданьні дзяржавы, але і перавыконваць іх.

Аб гэтым апошнім з надзвычайнай выразнасьцю гавораць вынікі тэй работы, якая праведзена па сельсавеце ў парадку падрыхтоўкі да гарпартканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б.

Калгасьнікі і аднаасобнікі Даўжанскага сельсавету ў падарунак гарпартканфэрэнцыі высунулі і выканалі сустрэчны плян у колькасьці 6 тон, узьняўшы агульны процант выканаьня пляну да 105 проц.

Пастанова ЦК КП(б)Б аб конкурсе, ліст калгасьнікаў Уваравіцкага раёну выклікалі новы ўздым сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў, які практычна аформіўся ў другі сустрэчны плян у колькасьці 5 тон збожжа.

Заклік уваравіцкіх калгасьнікаў—заваяваць права рапартаваць XIV зьезду КП(б)Б — быў падхоплен калгасьнікамі «Пяжкай індустрыі». Агульны сход гэтага калгасу высунуў сустрэчны плян у колькасьці 1 тоны і выклікаў на сацспаборніцтва іншыя калгасы сельсавету.

Нарада старшынь калгасаў, а пасьля агульныя сходы калгасьнікаў, ідучы па прыкладзе «Пяжкай індустрыі», на выклік уваравіцкіх калгасьнікаў адказалі тонамі збожжа. 13 студзеня чырвонымі абозамі ўжо зданы 4 тоны збожжа.

Цалкам падтрымліваючы лёзунг уваравіцкіх калгасьнікаў—ні аднаго сельсавету і калгасу, ні аднаго паселішча бяз сустрэчнага пляну па збожжазагатоўках, рэалізаваўшы практычна гэты лёзунг, Даўжанскі сельсавет выклікаў усе сельсаветы Віцебскага раёну пасьледаваць яго прыкладу.

Перамогі Даўжанскага сельсавету забясьпечаны шырокай масава-растлумачальнай работай, мэтадамі сацыялістычнага спаборніцтва, якія ўжываліся ў збожжазагатоўчай рабоце асобных калгасаў, і ўпартай барацьбой з кулакам, з рэацка-спажывецкімі тэндэнцыямі, з апартунізмам.

Даўжанскі сельсавет заваяваў права рапартаваць партыйнай канфэрэнцыі і зьезду. У конкурсе на лепшае выкананьне збожжазагатоўчага пляну ён займе не апошнее месца.

Гэта абавязвае партыйныя ячэйкі і сельсавет яшчэ з большым напружаньнем сіл узяцца за паддзяваньне адсталых вучасткаў і ў прыватнасьці за рэалізацыю пляну ільназагатовак.

САМУЦІН В., БРАЙНІН Б.

Тав. ГУДАЎ С. П. — старшыня Даўжанскага сельсавету

Аб правядзеньні ленінскіх дзён

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б

1. Асноўнымі лёзунгамі ў правядзеньні ленінскіх дзён павінны быць: мабілізацыя шырокіх працоўных мас на выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, за сацыялістычныя адносіны да працы, за марксыцка-ленінскае выхаваньне партыйных, камсамольскіх і працоўных мас, за правядзеньне ленінскай нацыянальнай палітыкі, за павышэньне якасьці работы ўсіх арганізацый у напрамку апэрацыйнага канкрэтнага кіраўніцтва на аснове правядзеньня ў жыцьцё 6-ці гістарычных умоў тав. Сталіна.

2. Масавая работа ў часе ленінскіх дзён павінна праходзіць у напрамку:

а) паказу найшырэйшым працоўным масам перамог сацыялізму ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі Савецкага Саюзу на аснове пасьлядоўнага правядзеньня генэральнай лініі партыі Леніна;

б) растлумачэньне ролі і значэньня ленінскай бальшавіцкай партыі ў справе барацьбы за сацыялізм, як кіраўніка і арганізатара перамог сацыялістычнага будаўніцтва;

в) азнаямленьня шырокіх пралетарскіх і калгасных мас з непрымірымай барацьбой камуністычнай партыі за чыстату сваіх радоў, за ленінскае адзінства ў партыі, растлумачэньня таго, што разгром контр-рэвалюцыйнага трацкізму, які зьяўляецца перадавым атрадам контр-рэвалюцыйнай буржуазіі, рашучая барацьба з правым апартунізмам — галоўнай небясьпекай на даным этапе, барацьба з «левымі» ўхіламі і прымірэнцтвам да іх яшчэ больш загартавала ленінскія рады;

г) Скарыстаньня ліста тав. Сталіна «Аб некаторых пытаньнях гісторыі бальшавізму» у мэтах аўладаньня марксыцка - ленінскай тэорыі і далейшага разгортваньня рашучай барацьбы супроць трацкісцкіх кантрабандыстаў, фальсыфікацыі і скажэньняў гісторыі бальшавізму. Неабходна растлумачыць ролю У. І. Леніна ў барацьбе супроць трацкістаў, меншавікоў, люксэмбургіянскіх памылак і апартуністаў усіх колераў, за бальшавіцкую партыю пралетарыяту, за чыстату маркісцкай тэорыі пралетарскай рэвалюцыі ва ўсёй сваёй рэвалюцыйнай пасьлядоўнай дзейнасьці, за пралетарскую дыктатуру ў СССР, за сусьветную пралетарскую рэвалюцыю.

3. Правядзеньне ленінскіх дзён павінна яшчэ больш завастрыць увагу ўсёй партыі да тэарэтычнага фронту клясавай барацьбы і разгортваньня масавага марксыцка-ленінскага выхаваньня шырокіх пралетарскіх мас.

ЦК КП(б)Б лічыць неабходным правесьці наступнае:

а) у часе ленінскіх дзён агітгасаваму аддзелу і культпропу ЦК, БАП, фракцыі таварыства марксыстаў, Камвузу імя Леніна арганізаваць па буйнейшых прадпрыемствах, калгасах, саўгасах даклады і гутаркі аб значэньні ленінскіх дзён;

б) ва ўсіх прадпрыемствах, калгасах і саўгасах правесьці з 18 па 25 студзеня гутаркі з групамі рабочых, калгасьнікаў аб рэвалюцыйным шляху Леніна, аб барацьбе партыі за сацыялізм, за капэральны плян Леніна, аб задачах чацьвертага, заключнага году пяцігодкі. 21-га студзеня правесьці масовыя вечары і пасяджэньні парт., савецкіх і грамадзкіх арганізацый;

в) масавую работу ў часе правядзеньня ленінскіх дзён падпарадкаваць выкананьню вытворчых задач прадпрыемстваў, саўгасаў і калгасаў і скончэньню ўсіх відаў загатовак і ўкладзць з падрыхтоўкай да XIV зьезду КП(б)Б і XVII партканфэрэнцыі;

г) культпропу ЦК даць указаньні аб правядзеньні ва ўсёй сетцы партпросвету спецыяльных заняткаў;

д) культпропу ЦК распрацаваць і даць указаньні газетам аб асьвятленьні правядзеньня ленінскіх дзён;

е) даручыць ГК і РК і фракцыям прафарганізацый правесьці ў часе ленінскіх дзён работу і станоўчага прадпрыемстваў, саўгасаў, калгасаў і ўстаноў, якія носяць імя Леніна пад пунктам выкананьня імі ўзятых на сябе абавязкаў.

КАНДЫДАТУРА ПРАЛЕТАРЫЯТУ

супроць кандыдатуры экспле ататараў і прыгнятальнікаў

Пастанова ЦК кампартыі Германіі аб прэзыдэнцкіх выбарах

БЭРЛІН, 13. ЦК кампартыі, абмеркаваўшы пытаньне аб прэзыдэнцкіх выбарах, прыняў пастанову, у якой гаворыцца, што кампартыя прыме самастойны ўдзел у выбарчай барацьбе шляхам выстаўленьня свайго кандыдата і самай актыўнай мабілізацыі прычпечаных народных мас. Кампартыя разглядае прэзыдэнцкія выбары і ўсе другія выбары і ўсенародныя галасаваньні, не як парляманцкую задачу, а як сустаўную частку па-за парляманцкай барацьбы «клясы супроць клясы».

Выстаўленьне камуністычнай рабочай кандыдатуры, клясавай кандыдатуры пралетарыяту супроць усіх эксплёататараў і прыгнятальнікаў набывае асабліва вялікае значэньне з прычыны імкненьняў аб'яднаць у адзіны рэакцыйны блёк за кандыдатуру сучаснага прэзыдэнта Гіндэнбурга ўсіх агентаў германскага і заграничнага фінансавага капіталу ад нацыянал-сацыялістаў да сацыял-дэмакратыі.

ЦК пастанавіў выставіць кандыдатуру прадстаўніка кампартыі Германіі **Тэльмана.**

Кампартыя праводзіць выбарчую барацьбу як па-за парляманцкую нагавую кампанію, апіраючыся на ўсе клясавыя арганізацыі і групы адзінага фронту пралетарыяту пад лёзунгамі: **«Кляса супроць кляс», «чырвоны адзіны фронт супроць рэакцыі ад Зэвэрынга да Гітлера», «за чырвонага рабочага рабочага кандыдата супроць кандыдата капіталу, фашыстаў і сацыял-дэмакратыі», «за кандыдата сацыяльнага і нацыянальнага вызваленьня супроць кандыдата ваеннай далины і рэпарацыі», «за кандыдата галечы супроць кандыдата багацеяў», «за хлеб і волю—супроць галечы і прыгнечаньня», «за вольную сацыялістычную Германію ў саюзе з СССР і сусьветным пралетарыятам супроць збанкрутаваўшага капіталізму».**

Кампартыя заклікае ўсю рабочую клясу і ўсіх ці пнетаных гораду і вёскі ўсюды распачаць пад гэтымі лёзунгамі барацьбу, пылучыць у дапамогу кампартыі дзесяткі тысяч актывістаў па правядзеньні выбарчай кампаніі, стварыць на прадпрыемствах і біржах працы чырвоныя камітэты адзінства і адкаць свае галасы за чырвонага рабочага кандыдата тав. Тэльмана (ТАСС).

Падрыхтоўка да ленінскіх дзён за мяжою

БЭРЛІН. У сувязі з 13-й гадавінай існаваньня Германскай кампартыі, у студзеньскія дні ва ўсёй Германіі адбудзецца рад мітынгаў і сходаў. Адначасова будзе адзначана гадавіна сьмерці Леніна і забойства Карла Лібкнэхта і Розы Люксэмбург.

У адным **Бэрліне** ў бліжэйшыя тры дні будзе праведзена **25 сходаў**, прысьвечаных гадавіне кампартыі. Кампанія адкрыецца мітынгам, які адбудзецца с

НАРАЁННЫХ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫЯХ

За бальшавіцкую непрымірымасьць да ўсякіх скажэньняў партыйнай лініі

8-я рэчыцкая партканфэрэнцыя закончыла свае работы. Канфэрэнцыя заслухала даклад ЦК КП(б)Б. які зрабіў тав. [illegible]севіч. Пасьля ўсебаковага абгаварэньня дакладу тав. Грысевіча **канфэрэнцыя адназгодна ўхваліла палітычную лінію ЦК КП(б)Б.**

Другім пытаньнем канфэрэнцыя заслухала даклад тав. **Казачонка** аб рабоце ЦКК.

Са справаздачы РК КП(б)Б відаць, што прамысловасьць Рэчыцкага раёну за мінулы год значна ажыварылася. Калі капітальныя ўкладаньні ў прамысловасьць рэспубліканскага маштабу ў 1930 годзе раўняліся 715.274 руб., дык у 1931 г. капіталаўкладаньні вырасьлі да 722.210 руб. Прычым у гэту лічбу по ўваходзіць укладаньне на пабудову новага экстрактнага заводу, гадавая прадукцыя якога раўнаецца 2.120 тонам. У рабоце закамплектаваецца будаўніцтва новай швейнай фабрыкі, на якой будзе занята ня менш 200 чал. Для апраноўкі сельска-гаспадарчай прадукцыі пабудован новы крухмальны завод, заканчваецца пабудовай ільназавод.

Шпаркае разьвіцьцё прамысловасьці патрабавала ад партыйнай арганізацыі карэннай перабудовы сваёй работы, патрабавала ўменьня канкрэтна і аперацыйна кіраваць. Якраз гэтага не хапала ў рабоце Рэчыцкай партарганізацыі. Адсутнасьць перабудовы работы раду вытворчых калектываў, невыстарчальная наблізацыя мас на рэалізацыю 6-ці сталінскіх умоў прывялі да таго, што прамысловасьць Рэчыцы скончыла 3-ці рашаючы год з недавыкананьнем вытворчай праграмы. На заводах імя Варашылава і імя Томскага ня толькі ня сьніжан, а павышан на 70-80 проц. сабекошт прадукцыі.

Галоўная вузлавая задача калгаснага руху — арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў — ня стала лічэ ў цэнтры ўвагі ўсіх партыйных ячэек. **Калгасы імя Калініна і імя Дзяржынскага далі ўзорныя прыклады пастаноўкі работы. Але гэтыя станоўчыя ўзоры не перанесены на другія калгасы.**

Некаторыя асобныя ячэйкі работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў падмянілі «ліваўскай» пагоняй за дутымі процантамі калектывізацыі. У Караваўцікім, Дзяржэвіцкім і Засьпінскім сельсаветах «леваўі» даводзілі цьвёрдыя заданьні да серадняко́ў і нават бедноты з мэтай прымусіць іх пайсьці ў калгас. У гэтых сельсаветах сярод абкладзеных індывідуальна выяўлена 45 проц. бедноты і серадняко́ў.

Старшыня Дзяржэвіцкага сельсавету **Чырык** Сідар ставіў пытаньне проста—пойдзеш у калгас, зьнімем цьвёрдае заданьне, а ня пойдзеш — будзеш уносіць тое, што накладзена.

У Бабінскім сельсавеце калгасы засьмечаны кулацкімі элементамі. Пралежныя кулакі з мэтай разбурыць калгасы з сярэдзіны, распальваюць рвацкія тэндэнцыі, падрываюць справу выкананьня загатовак.

Раённыя работнікі замест таго, каб выяжджаючы ў калгас, дапамагчы ім у арганізацыі працы, ва ўвядзеньні зьдзельшчыны, ня толькі гэтага не рабілі, а дапускалі яўныя скажэньні рэвалюцыйнай законнасьці. **Інструктар райкалгассаюзу Махнач,** будучы ў адным з сельсаветаў, не ўлазіў у старшыню сельсавету Шыхаўца. Махнач, доўга не разважаючы, заявіў: «З гэтага часу вы зьнімаецеся з работы».

Раённы камітэт партыі замест таго, каб ударыць па галавацяцтве таго «інструктара», пастанавіў даць яму... на від.

Делегаты канфэрэнцыі ў сваіх выступленьнях паказалі, што райком партыі ёё невыстарчальнае змаганьне супроць правяўленьняў ухілу да вялікадзяржаўнага шавінізму, супроць антысэмітызму. Райком партыі на канкрэтных фактах не мабілізаваў партыйную арганізацыю на ўзмацненьне барацьбы з ухіламі ў нацыянальным пытаньні.

Райпартканфэрэнцыя ўскрыла гэтыя недахопы ў рабоце раённага камітэту партыі і паставіла перад арганізацыяй цэлы рад задач. Канфэрэнцыя мабілізавала партыйную арганізацыю на ліквідацыю таго адставаньня, якое ёсьць на радзе вучасткаў работы, мабілізавала партарганізацыю на безьлітаснае змаганьне супроць усялякіх скажэньняў партыйнай лініі ў тэорыі і на практыцы.

А. Маньноў.

Рэалізацыя 6 умоў тав. Сталіна забясьпечвае вытворчыя перамогі

Партыйны калектыў заводу «Камунар» правёў значную работу па ажыцьцяўленьні 6 умоў тав. **Сталіна.** Працаўёка-сярод рабочых прамовы прадыдыра партыі адбывалася побач з вызначэньнем канкрэтных мерапрыемстваў па рэалізацыі задач, якія зьяўляюцца асноўнымі ў справе забесьпячэньня вытворчых перамог.

Тормазам пасьпяховага выкананьня прамфінпляну на заводзе «Камунар» была значная пашыраная ўраўнілаўка, абязьлічка і інш. Па зьнішчэньне гэтых недахопаў у першую чаргу і накіраваў сваю ўвагу партыйны калектыў.

Зараз на заводзе пераведзена на вядзельшчыну 90 проц. усіх рабочых, на прагрэсыўна - прэміяльную аплату пераведзена 370 чал. Таксама пераведзена за прагрэсыўна - прэміяльную аплату 30 чал. інжынэрна - тэхнічнага персаналу, заработак якіх вылічаецца ў залежнасьці ад выкананьня прамфінпляну таго ці іншага цэху.

Першыя мерапрыемствы па ажыцьцяўленьні адпай з умоў тав. Сталіна забясьпечылі значнае павышэньне прадукцыйнасьці працы. Калі да часу ліквідацыі ўраўнілаўкі многія рабочыя ня выконвалі сваіх норм, дык зараз ня толькі гэтыя нормы поўнасьцю выконваюцца, а ў значнай частцы і перавыконваюцца. Перавыкананьне норм даходзіць у радзе выпадкаў да 55 проц. Ліквідацыя ў асноўным ураўнілаўкі і абязьлічкі спрыяла эфэктыўнасьці і ў якасных паказальніках. Напрыклад, у ліцейным цэху зьнижан брак з 14 да 7 проц. Аналёгічныя паказальнікі ёсьць і ў другіх вытворчых зьвеньнях.

У пачатку пераводу цэхаў на гаспадарчы разрахунак мелі месца элементы фармальнага падыходу да гэтай справы. Партыйны калектыў, рашуча змагаючыся з такімі праяўленьнямі, забясьпечвае сваёй работай сапраўднае ўкараненьне гаспадарчага разрахунку ва ўсе вытворчыя зьвеньні заводу. У парадку сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва на заводзе арганізавана 7 гаспадарча - разрахунковых брыгад. Эфэктыўнасьць работы гэтых брыгад значная. Побач з пасьпяховым выкананьнем гэтымі брыгадамі вытворчага заданьня дасягнута вялікая эканомія ў выдаткаваньні матар'ялаў.

Треба адзначыць, што ажыцьцяўленьне ўказаньняў тав. Сталіна праводзілася на заводзе ўсё-ж такі даволі марудлымі тэмпамі. **Зараз гэта работа ўзьнята на вышэйшую ступень у сувязі з разгорнутай падрыхтоўкай да другой Менскай гарадзкой партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б.** Партыйны калектыў паставіў перад сабою цэнтральнай задачай неадкладнае завяршэньне перабудовы работы на прадпрыемстве ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі і задачамі. Гэта зьлучэнцца стрыжнявой задачай у справе забесьпячэньня пасьпяховага выкананьня па ўсіх паказальніках вытворчай праграмы чацьвертага, заключнага году пяцігодкі.

ШЭЛЬКРАДТ, ПАЛЯКОЎ, ПІСЬМАН.

Магілеўская

Начала свае работы 2-я раённая партканфэрэнцыя Магілеўскай арганізацыі. Адкрываючы канфэрэнцыю, сакратар райкому КП(б)Б тав. **Малашонак,** характарызуючы ва ўступным слове работу партыйнай арганізацыі за перыяд ад 1-й канфэрэнцыі, паказаў на рад тых посьпехаў, якіх дабілася партарганізацыя. Тав. Малашонак зазвярнуў увагу делегатаў на задачы самага шырокага разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі, на задачы выяўленьня ўсіх недахопаў у рабоце арганізацыі.

Партыйная канфэрэнцыя адназгодна ўхваліла выбраць у ганаровы прэзыдыум **палітбюро ЦК УсеКП(б), т. т. Рудзутака, Тэльмана, Ленскага, Гел, Шаранговіча і Галадзеда.**

З дакладам ЦК КП(б)Б выступіў тав. Гантман. У 3-хгадзінным прамове тав. Гантман падрабязна высьветліў міжнароднае становішча, посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва Савецкага Саюзу і яго неадлучнай часткі—БССР і выразна акрэсьліў тыя задачы, якія стаяць перад партарганізацыяй у 4-м, заключным годзе пяцігодкі.

Канфэрэнцыю віталі рабочыя-ўдарнікі — прадстаўнікі буйнейшых прадпрыемстваў Магілева: шаўковай фабрыкі, гарбарні імя Сталіна і інш. Рабочыя-ўдарнікі дзёна чыгуначнага вузла ў падарунак канфэрэнцыі і падыхожачаму XIV зьезду КП(б)Б адрамантавалі зьвыш пляну 2 паравозы № 13 і 14 НК. Рабочыя дзёна ўзялі на сябе абавязак да XIV зьезду КП(б)Б і XVII партканфэрэнцыі выпусьціць з сярэдняга рамонту 4 паравозы. Рабочыя гарбарні імя Сталіна рапартавалі канфэрэнцыі аб выкананьні пятгодзічнай праграмы 3-га, рашаючага году пяцігодкі на 102,6 проц.

Калгаснікі, беднякі і сераднякі — адназгодніка Боркаўскага сельсавету рапартавалі канфэрэнцыі аб звышпляновым продажы збожжа дзяржаве. Яны чырвоным абозам даставілі 360 цэнтн. збожжа. Калгаснікі і адназгодніка Вандарскага сельсавету да партыйнай канфэрэнцыі выканалі плян загатовак на 120 проц. і ў гонар канфэрэнцыі дадаткова здалі 90 цэнтн збожжа.

ПРАХАРЭНКА.

Баўруйская

На вячэрнім пасяджэньні другога дня работ канфэрэнцыі абгаворваліся спрэчкі па дакладу Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б. З заключным словам выступіў тав. **Рыскін.**

Канфэрэнцыя адназгодна прыняла палітычную лінію ЦК КП(б)Б правільнай. Для распрацоўкі праекту рэзалюцыі вылучана камісія з 12 асоб.

14 студзеня на раённым пасяджэньні заслухана **справаздача раённага камітэту КП(б)Б, якую зрабіў сакратар РК тав. Ваўковіч.**

На працягу ўсёй работы канфэрэнцыі прыбываюць шматлікія делегацыі рабочых і калгаснікаў, рапартуюць партарганізацыі аб сваіх перамогах.

М.

Аб ходзе конкурсу нізавога друку
Пастанова ЦК КП(б)Б
ад 7-га студзеня 1932 г.

1. ЦК КП(б)Б адзначае, што рад раённых арганізацый КП(б)Б паказае прыклады сапраўды бальшавіцкай работы па **ўзначаленьні** абвешчанага газэтай «Правда» ўсесаюзнага конкурсу на лепшую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, (Менск, Гомель, Слуцак, Талочына, Лёзна, Жлобін, Ельск, Дрыса і г. д.)

Разам з тым, поўная частка раёнаў БССР усё яшчэ надзвычай слаба разгортвае работу па гэтым, адным з адказных вучасткаў, незабясьпечыўшы патрэбнага размаху, масавасьці, ініцыятыўнасьці і мабілізацыі ўвагі і сіл партыйнай арганізацыі і ўсёй пралетарскай грамадзкасьці (Віцебск, Магілеў, Мазыр, Горкі, Чырвонапольле, Бярэзіна, Жыткавічы, Турэў, Лагойск, Гарадок, Смалявічы, Асіповічы, Мсьціслаўль, Чаўусы, Бешанковічы і г. д.).

2. ЦК КП(б)Б абавязвае ГК і РК КП(б) [illegible] раёнаў БССР, якія дагэтуль не разгарнулі работы па конкурсе **безадкладна забясьпечыць рашучы пералом** і дабіцца поўнага выкананьня ўказаньня аб тым, што «справа правядзеньня конкурсу «Правды»—справа ўсёй КП(б)Б, справа ўсёй пралетарскай грамадзкасьці БССР».

3. Згадзіцца з прапановай Культпропу ЦК аб камандыраваньні ім разам з цэнтральнай конкурснай камісіяй «Зьвязды» і Белкалгасцэнтрам 27 брыгад тэрмінам на 3 тыдні ў 16 калгасаў, 7 саўгасаў і 4 МТС для дапамогі месцовым пасьцённым газэтам у барацьбе **за цэнтральную задачу калгаснага будаўніцтва — арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за поўнае выкананьне ўсіх загатовак сваяй часовую падрыхтоўку да веснавой пасеўнай кампаніі.** Гэтыя ж брыгады потым перакінуць (тэрмінам на 3 тыдні) для дапамогі рэдакцыям 23 раённых газэт у іх рабоце па конкурсе. Лічыць неабходным пасылку з боку ГК, РК КП(б)Б брыгад у дапамогу пасьцённым газэтам найбольш адсталых калгасаў і саўгасаў.

4. Адзначыць, што рэдакцыі газ. за выключэньнем «Калгасьніка Беларусі» і частково паўпрэдпрыемства «Правды» [illegible] ажыцьцяўленьня дапамогу [illegible] да іх раённым газэтам у справе разгортваньня работы па конкурсе.

Абавязаць рэдакцыі цэнтральных і раённых газэт больш сыстэматычна асьвятляць ход конкурсу шляхам разгорнутага паказу работы пасьцённых і шматтыражных газэт канкрэтных калгасаў, саўгасаў і МТС, партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам і работай сярод рабселькораў, а таксама ходу аб вешчанага па ініцыятыве БССР сацыялістычнага спаборніцтва з друкам і рабселькорамі УССР і Паўночнага Каўказу.

5. Абавязак ГК і РК КП(б)Б сыстэматычна заслухоўваць даклады партыйных ячэек (з правяраньнем папярэдняга абсьледваньня) аб выкананьні пастаноў ЦК КП(б)Б, аб задачах работы па конкурсе «Правды»

К. ГЕЙ

НА ШЛЯХУ ДА НОВЫХ ДАСЯГНЕНЬНЯЎ

Камуністычная партыя Беларусі прайшла вялікі шлях паміж XIII і XIV сваімі зьездамі. Асноўныя зрухі ў гаспадарчым жыцьці БССР характарызуюцца такімі, напрыклад, паказальнікамі: удзельная вага прамысловай прадукцыі складала ў 1930 г. 38,7 проц. у адносінах да ўсёй прадукцыі народнай гаспадаркі; у 1931 годзе гэта ўдзельная вага ўзьлялася да 50,4 проц. У сельскай гаспадарцы значна вырасьлі, пакрыпіліся і ўмацаваліся саўгасы; калектывізацыя, якая ахапляла да моманту XIII зьезду КП(б)Б (май 1930 г.) 11-12 проц. селянскіх гаспадарак, узьнялася да 59,4 проц. да пачатку 1932 году. Гэта забясьпечыла пераважную ролю сацыялістычнага сэктару ў таварнай прадукцыі сельскай гаспадаркі.

Прамысловасьць БССР разьвівалася ў 1930-31 г. тэмпамі больш высокімі, чым агульнасаюзныя. Калі штогадовы прырост прадукцыі прамысловасьці па Саюзе на працягу першых 3-х год пяцігодкі складаў 21-24 проц., то для БССР адпаведныя лічбы давалі ў 1928-29 г. — 40,8 проц., у 1930 годзе — 61 проц., у 1931 г. — 79 проц. Уступіў у строй дзейных фабрык і заводаў рад новых прадпрыемстваў, сярод іх — Белдрэс імя Сталіна, магілеўская фабрыка штучнага валакна, завод сельска-гаспадарчых машын у Гомелі (сіласарэмі), віцебскім швейная і трыкатажная фабрыкі і рад іншых. На чарзе пуск крычаўскага цэментнага заводу, гомельскай мэханізаванай гуты, прэваапрацоўчага камбінату ў Гомелі і г. д.

Адзін гэты пералік найбольш буйных аб'ектаў капітальнага будаўніцтва апошняга часу ўжо дае ўяўленьне аб напрамку разьвіцьця прамысловасьці БССР у бок выкарыстаньня мясцовых сырцовых рэсурсаў. Старое ўяўленьне аб Беларусі, як аб краіне, якая ня мае сваёй сырцовай базы для прамысловасьці, павінна быць рашуча ахілена. Моцную сырцовую базу ў БССР маюць прэваапрацоўчая, паперовая, тэкстыльная (лён і штучнае валакно), шкляная, броварная, крухмальная прамысловасьці і розныя віды хаўрчовай прамысловасьці. У бліжэйшым будучым вялікую ролю ў прамысловым разьвіцьці БССР адыграюць хімічная прамысловасьць (фасфарыты, апэтон, лесахэмія, перапрацоўка сапрапэлітавых пакладаў і рад іншых вытвораў), выраб будаўнічых матар'ялаў (цэмэнт, агнеўпоры, кераміка, новыя будматар'ялы) і, нарэшце, мэталяапрацоўчая прамысловасьць, якая мае ўсе перспэктывы для свайго разьвіцьця, апіраючыся на такіх моцных шлях, які зьявяе БССР з паўдзённай мэталургічнай базай.

Шпаркі рост прамысловасьці БССР, якая выкапала сваю пяцігодку за тры з паловай гады, паставіў перад КП(б)Б ва ўвесь рост пытаньне аб энэргетычнай базе, якая забясьпечыла-б высокія тэмпы прамысловага разьвіцьця. Такой базай ва ўмовах БССР можа зьявіцца толькі торф. Ні лес, які вельмі зьмяншыўся і да таго-ж багаты каштоўнымі пародамі, якія ідуць у пераапрацоўку на будаўніцтва, ні шматлікія рэкі, як правіла, якія маюць малы спад і ніжнія берагі, ня могуць вырашыць апалава - энэргетычную праблему БССР ня толькі для бліжэйшага будучага, але і для данага часу. Прывозны апал таксама не прадстаўляе сабою, вядома, вырашэньня гэтай праблемы. Перад КП(б)Б стаіць, такім чынам, задача асвоіць торф, як асноўную крыніцу жыўленьня электрастанцый і заводзкіх сілавых установак. Іменна пад гэтым кутом погляду зьяўляюцца асаблівла недапушчальнымі тыя прарывы ў торфаздабычы, якія мелі месца летам 1931 году. Абязьлічка і ўраўнілаўка, дрэнная арганізацыйна-гаспадарчае кіраўніцтва, невыстарчальная ўвага в боку раду партарганізацый да гэтых пытаньняў былі асноўнымі прычынамі, якія абумовілі гэтыя прарывы.

Праводзячы і ў далейшым барацьбу за асваеньне мясцовых апалавых і сырцовых рэсурсаў, КП(б)Б павінна на XIV зьезьдзе падвесьці вынікі правядзеньня ў жыцьцё 6 умоў тав. **Сталіна.** За пяцігод. якія прайшлі з часу гістарычнага выступленьня тав. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў, па ўсіх прадпрыемствах БССР узрос процант працуючых зьдзельна, скарацілася цякучасьць, заключаюцца дагаворы з калгасамі на пастаўку рабочай сілы, паленшылася абслугоўваньне культурна-бытавых патрэб рабочых, разгарнуўся шырокі рух за стварэньне гаспаларча-раздахунковых брыгад, за прымацаваньне работніка да пэўнага варштату, агрэгату, за павышэньне ажыцьцяўленьня, за скарачэньне браку і г. д.

Аднак, рашучага зруху дабіліся толькі тыя прадпрыемствы, якія сапраўды ва-бальшавіцку змагаліся за ажыцьцяўленьне ўказаньняў правадыра партыі і рабочай клясы — т. Сталіна. У большасці прадпрыемстваў сустракаецца яшчэ ў розных формах рад выпадкаў і ўраўнілаўкі і абязьлічкі. Вельмі марудна адбываецца пераход ад групавой зьдзельшчыны да індывідуальнай, мае месца рад скажэньняў пры ўвядзеньні прагрэсыўнай аплаты, што прыводзіла да павышэньня заробкаў па-за ўсякай залежнасьцю ад павышэньня паказальнікаў працы. Укараненьне гаспадарчага разрахунку сустрэла апартуністычнае супраціўленьне з боку часткі гаспадарчых і прафсаюзных работнікаў.

Такім чынам, асноўнай задачай **навыхадзячага XIV зьезду КП(б)Б зьявіцца мабілізацыя партыйнай арганізацыі на далейшую барацьбу за ажыцьцяўленьне 6 гістарычных указаньняў тав. Сталіна.**

Побач з выкананьнем колькасных паказальнікаў, неабходна мабілізаваць партыйныя арганізацыі на безумоўнае выкананьне якасных паказальнікаў.

У галіне сельскай гаспадаркі асноўная ўвага КП(б)Б павінна быць скансцентравана на **арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў і палепшэньні работы саўгасаў.** Гэтыя задачы можна ажыцьцявіць толькі пры ўмове правядзеньня тых-жа ўмоў, пры стасоўна да канкрэтнай абстаноўкі ў сацыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі. Абсьледваньне 40 калгасаў, праведзенае ў перыяд веснавой сяўбы, паказвае выкарыстаньне рабочай сілы калгасаў усяго на 57 проц., адыход на іншыя работы на-за калгасаў складаў 8 проц. Значыцца, 35 проц. паяўных у калгасах чалавека-дзён заставаліся невыкарыстанымі. Гэтыя лічбы паказваюць, якія вялізарныя магчымасьці далейшага разьвіцьця калгаснай гаспадаркі заістаюцца яшчэ нераалізаванымі. Калі нават улічыць, што пэўная частка працоўных рэсурсаў калгасаў будзе выкарыстана больш чым рока ў прамысловасьці, будаўніцтве і на іншых адыходных работах, у калгасах застаецца вельмі значны лішак рабочых рук, які дазваляе пры правільнай арганізацыі працы шпарка ісьці па шляху сацыялізацыі і інтэнсыфікацыі калгаснай гаспадаркі.

Паказальнікі работы сьведчаць аб вялікіх зрухах у галіне сельскай гаспадаркі, значна пашырыліся пасяўныя плошчы пад ільном, якія дасягнулі ў 1931 г. 239.000 га, прычым удзел калгасаў у пасевах ільну выявіўся ў 51,6 проц. пры паяўнасьці 35-40 проц. ахопу калектывізацыяй вясной 1931 году. Галавы плян камплектаваньня калгасных МТФ быў выкананы па 1-е сьнежня 1931 г. у размеры 107,9 проц., па сівіднагадоўчых фэрмах — у разьмеры 79,7 проц. Сьвіное стада ў саўгасах вырасла са 175 тыс. штук да 200 тыс. у 1931 г. Стада рагатай жывёлы ў саўгасах вырасла з 38,7 тыс. да 75,9 тыс. штук.

Гэтыя лічбы, таксама як і хуткі рост машынізацыі сельскай гаспадаркі, сьведчаць аб тым, што спэцыялізацыя с.-г. БССР ў кірунку разьвіцьця тэхнічных культур, малочнай жывёлагадоўлі і сьвінагадоўлі ідзе поўнымі крокамі ўперад, прычым сацыялістычны сэктар займае бясспрэчна ведучую і кіруючую ролю ў гэтых працэсах. Аднак, пры ацэнцы гэтых рэзультатаў нельга ні на хвіліну забываць таго, што яны ласягнуты ва ўмовах выключна дрэннай арганізацыі працы ў калгасах, у першы год далёка яшчэ ня поўнага тэрміновага выкананьня [illegible], пры паяўнасьці ўтрымальных тэндэнцый, якія так яркі праявіліся, напрыклад, у саўгасах увосень мінулага году, і г. д.

Адзначана з гэтым КП(б)Б павінна будзе выпрацаваць праграму работ падыходзячага году, якая на аснове арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і палепшэньня работы саўгасаў, высунае рад больш высокіх якасных патрабаваньняў.

Закранаючы пытаньні сельскай гаспадаркі, нельга не адзначыць памылак ЦК КП(б)Б, дапушчаных летам 1931 году. Гэтыя памылкі ішлі па лініі недаацэнкі задачы арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і выяўліліся ў імкненьні скараціць тэрміны калектывізацыі БССР паваг у адносінах да ўстановак, даных у вядомай пастанове ЦК УсеКП(б) ад 2 жніўня 1931 г. Пры дапамозе «Правды», якая дала выразную палітычную ацэнку гэтым памылкам, ЦК КП(б)Б пераглядзеў і выправіў свае дырэктывы і мабілізаваў партыйную арганізацыю на ажыцьцяўленьне ўказаньняў ЦК УсеКП(б)Б па калгасным будаўніцтве, ударыўшы адначасова па радзе выпадкаў шкоднай за дутымі процантамі, якія мелі месца ў асобных раёнах БССР.

Дасягнутым посьпехам КП(б)Б у сацыялістычным будаўніцтве ў немалой ступені спрыяла пасьлядоўнае і правільнае ажыцьцяўленьне нацыянальнай палітыкі партыі. Пасьля XIII зьезду КП(б)Б праводзіла далей рашучую барацьбу з нацыянал-дэмакратызмам, выкрыўшы і разграміўшы контр-рэвалюцыйную дзейнасьць некаторых былых БНР'аўскіх міністраў. КП(б)Б ачысьчала свае рады ад нацыянал-апартуністычных элементаў.

Адпачасова КП(б)Б цярпіла капітулявала неабходнасьць рашучай барацьбы супроць ухілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму, які зьявіўся галоўнай небясьпекай на даным этапе, і нанесла рад удараў на канкрэтных посьпехах гэтага ўхілу (Вальфсон, Выпра і рад іншых).

Кастрычніцкі (1930 г.) пленум ЦК КП(б)Б указаў на неабходнасьць узмацненьня работы на беларускацы і паклаў пачатак добраахвотнаму руху на прадпрыемствах за вывучэньне беларускай мовы, беларускай літаратуры, гісторыі і г. д.

Рашучая барацьба ўсёй партыйнай арганізацыі на чале з ЦК КП(б)Б супроць ігнараваньня работы сярод нацыянальных меншасьцей прывяла да прыкметнага палепшэньня абслугоўваньня нацменшасьцей, выправіўшы, у прыватнасьці, рад грубых нарушэньняў лініі партыі ў адносінах гэтай работы.

У барацьбе супроць галоўнай небясьпекі — правага апартунізму, а таксама супроць «лявацкіх» скажэньняў, супроць прымірэнцтва і нішчэньня лібералізму за трацкіскай кантрабанды, КП(б)Б насьлядоўна праводзіла генеральную лінію партыі, забясьпечыўшы далейшы рост ідэйнай згуртаванасьці і павышэньне клясавай пільнасьці партыйнай арганізацыі.

Ідучы далей на гэтым-жа шляху непрымірымай барацьбы за генеральную лінію партыі, не спыняючыся на дасягнутых посьпехах, на-бальшавіцку крытыкуючы асобныя памылкі і недахопы сваёй работы, КП(б)Б, апіраючыся на праробленую вялікую работу, пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) на чале з тав. Сталіным, пойдзе наперад, да новых посьпехаў і дасягненьняў.

(«Правда»).

Я. ІЛЬЛІНСКІ

ІНТЭРВЭНЦЫЯ ФРАНЦУСКАГА ІМПЭРЫЯЛІЗМУ У КІТАІ

Адносіны амаль усяго капіталістычнага і сацыял-фашысцкага друку Францыі да акупацыі японскімі войскамі Манчжурыі, а роўна пазыцыя Брыяне на сэсіях рады Лігі нацый пры разглядзе японска-кітайскага канфлікту сьведчаць аб поўнай салідарнасьці інтарэсаў японскага і французкага імпэрыялізму ў Кітаі.

Як відома ўжо з прэсы, французкі імпэрыялізм пасьледваў ужо прыкладу японскіх акупантаў. Паводле слоў «Таймс», французкія калёніяльныя войскі, нібы праследуючы «бандытаў», уварваліся з Інда-Кітаю ў правінцыю Гуансі, імкнучыся захваціць Юнань з тым, **каб наладзіць паход супроць кітайскіх саветаў.** «Таймс» пры гэтым указвае, што Францыя імкнецца да панаваньня над паўднёвымі раёнамі Кітаю ня толькі для разгрому саветаў і Чырвонай армії, але і для захвату ў свае рукі нядаўна пракладзеных у Паўднёвым Кітаі чыгунак.

Перад урывам французкіх калёніяльных войск у паўднёвыя раёны Кітаю адбывалася вялікая падрыхтоўчая работа ў самым Інда-Кітаі. Як паведамляла шанхайская газэта «Сінвэнь-бао», з Інда-Кітаю сыстэматычна рабіліся палёты французкіх ваенных самалётаў над кітайскай тэрыторыяй, нават у самым Інда-Кітаі вяліся ўзмоцненыя ваенныя падрыхтаваньні (набор і навучаньне запасных, дастаўлялася цяжкая артылерыя ў пагранічныя раёны). Нядаўна ля самай кітайскай граніцы пачалі будавацца новыя казармы, пабудован быў аэрадром у Лянсоне, з Інда Кітаю быў забаронен вываз збожжа. Больш частымі ў апошні час сталі выступленьні ва французкай калёніяльнай прэсе Інда-Кітаю на тэму аб тым, што «эўранейскія дзяржавы павінны ў мэтах захаваньня дагавораў з Кітаем пасьледаваць прыкладу Японіі». Усе гэтыя ваенныя падрыхтаваньні, якія ішлі побач з адпаведнай апрацоўкай грамадзкай думкі, не пакідалі ніякіх сумненьняў у тым, што справа ідзе аб плянах інтэрвэнцыі ў Кітаі, якія пачалі ўжо ажыцьцяўляцца.

Характэрна, што амэрыканская газэта **«Іўнінг стар»** у сувязі з першымі паведамленьнямі аб урыве французкіх войск у Кітай, пісала, што гэтыя паведамленьні пацьвярджаюць весткі аб існаваньні франка-японскай згоды, заключанай ашчэ ў 1928-29 г.

«Іўнінг стар» далей паведамляе, што Францыя, у мэтах умацаваньня сваіх калёніяльных пазыцый, імкнецца заняць Юнань, **каб мець магчымасьць у будучым эксплёатаваць нафтаносную землю ў Бірме.** «Кіраўнікі французкай палітыкі,—пісала газэта,—разумеюць, што цяперашні момант зручны для ажыцьцяўленьня спроб перапраўляць Францыю ў дзяржаву, якая можа заняць тое месца ў сьвеце, якое займала Брытанская імпэрыя, што цяпер разваліваецца».

Колькі-б злоўленыя на месцы злачынства французкія імпэрыялісты не адмаўлялі факту ўрыву французкіх акупантаў у Паўднёвы Кітай, колькі-б яны не спасылаліся на «нармальныя армейскія манэўры» (гэта на чужой тэрыторыі!), фактам застаецца тое, што мы маем справу з пачаткам ажыцьцяўленьня далёка ідучых плянаў французкага імпэрыялізму ў Кітаі, якія праводзяцца ў поўнай згодзе з японскім імпэрыялізмам. Амэрыканскі друк ня спыняе ўпарта паведамляць аб сакрэтнай згодзе, заключанай паміж Францыяй і Японіяй аб падзеле Кітаю, указваючы, што паводле гэтай згоды Японія гарантуе Францыі права захвату тэрыторыі ў Паўднёвым Кітаі.

Треба адзначыць, што з першых дзён канфлікту французкі друк «превозносил» ролю Японіі, як «вартавога парадку на Далёкім Усходзе», як адзінага «аплоту» ў барацьбе супроць бальшавізму ў Кітаі і г. д. Ня трудна зразумець, які зьмест укладваў французкі друк у разуменьне «адпаўленьне парадку» ў Кітаі. Малочы па мэце лабіцца «ўціхамірання» акружаючых Інда-Кітай кітайскіх раёнаў, ахопленых савецкім уплывам, і імкнучыся да «рэальнай абароны Інда-Кітаю ад камунізму», французкія імпэрыялісты адносяцца з нескрытым спачуваньнем да японскай акупацыі Манчжурыі. Да гэтага ашчэ належыць дадаць зацікаўленасьць Францыі да ўмацаваньня «парадку» ў Манчжурыі для забесьпячэньня ранейшых капіталаўкладаньняў Францыі, а таксама ўкараненьня новых інвэстыцый, у прыватнасьці, укараненьня французкага капіталу ў чыгункі, якія будуюцца ў Паўднёвай Манчжурыі.

З другога боку, непасрэдная зацікаўленасьць Францыі японскай палітыкай у Манчжурыі вызначаецца тым, што **Японія стварае ў Манчжурыі плацдарм супроць СССР.**

«Лібэртэ» адкрыта заклікае Японію «зруйнаваць бальшавізм у стэпах Сібіры». Акупацыя японскімі войскамі Манчжурыі выклікала на старонках французкага друку ажыўленьне, спадзяючыся на адпаўленьне французкіх інтарэсаў на Далёкім Усходзе. Так, «Фігаро» патрабавала безагаворачнага падтрыманьня Японіі Лігай нацый на тэй падставе, што **«Японія натуральны саюзьнік Францыі ў Азіі і ў стане таму нэйтралізаваць СССР, адцягваючы яго сілы ад Эўропы»**

Да раду прычын, якія абумоўліваюць зближэньне Францыі з Японіяй на Далёкім Усходзе, неабходна паказаць і на тое, што гэта зближэньне забясьпечвае ўмацаваньне пазыцый Францыі на Ціхім акіяне. Даволі ўспомніць даўныя гутаркі ва французкім друку на тэму аб тым, што **Францыя «таксама ціхаакіянская дзяржава», паколькі галоўнейшай яе калёніяй зьяўляецца Інда-Кітай.** Зближэньне Францыі з Японіяй узмацняе пазыцыі Францыі ў барацьбе з ПАЗШ і Англіяй ня толькі на Ціхім акіяне, але і ў Эўропе, і ў **першую чаргу, зразумела, узмацняе антысавецкія пазыцыі французкага імпэрыялізму.** У сувязі з гэтым неабходна адзначыць і заяву «Дэйлі Калёніяль», што «Японія натуральны саюзьнік Францыі на Ціхім акіяне». Паводле слоў газэты, Францыя ў стане кампэнсаваць Японіі ану ляваньне ангельска-японскага саюзу і т. д. У барацьбе за гегемонію на Ціхім акіяне Францыя пусьціла ў ход усе свае козыры, адным з якіх зьяўляецца і **польска-японскае зближэньне,** аб якім паведамлялі некаторыя французкія газэты ў самы разгар пра соўваньня японскіх войск у Манчжурыю.

У сьвятле ўсяго сказанага становіцца зразумелымі прамільгнуўшыя ва французкім друку яўна інсынуаваныя паведамленьні аб гандлёвых перагаворах, якія пачаліся паміж Японіяй і Інда-Кітаем, вярней, паміж Японіяй і Францыяй. Гэтыя перагаворы павінны, з аднаго боку, абараніць Інда-Кітай ад надзвычайнага імпарту японскіх вырабаў, а, з другога боку, забясьпечыць збыт у Японію індакітайскага сырцу, у першую чаргу рысу і каўчуку. І, нарэшце, перагаворы павінны прывесьці да ўмацаваньня французкіх пазыцый на кітайскім рынку.

Ступень франка-японскага зближэньня характарызуецца пазыцыяй, занятай Японіяй у пытаньні аб разбраеньні, а таксама ацэнкай з боку французкага друку гэтай пазыцыі, як цалкам сумадзючай з французкім тэзісам **«раней бясьпечнасьць, а потым разбраеньне».** Треба ўспомніць з якой радасьцю «Фігаро» і «Эпрэсіжан» вітала нядаўна адмаўленьне Японіі ад усякіх разбраеньняў, у асаблівасьці матывовачную частку японскага аказу Лізе нацый, **накіраваную супроць СССР.**

Французкі друк пры гэтым яўна памякаў на тое, што пазыцыя Японіі ў адносінах канфэрэнцыі па разбраеньні разьлічана на простае падтрыманьне французкай пазыцыі і зьяўляецца як-бы кампэнсацыяй за падтрыманьне Францыяй Японіі ў манчжурскім канфлікце. Треба, нарэшце, успомніць выступленьне камуністычнага дэпутата **тав. Дорыё** на французкай палаце дэпутатаў 26 лістапада з заявай аб тым, што японскі ўрад узамен падтрыманьня ў манчжурскім канфлікце гарантаваў Францыі поўнае падтрыманьне французкага тэзісу

Калгасную вытворчасьць — на вышэйшую ступень

На аснове індустрыялізацыі, у непрымірымай барацьбе з правым апартунізмам — галоўнай небясьпекай — і «левымі» загібамі, разгаміўшы прынцэпіальную, КП(б)Б дасягнула вялікарных перамог у сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Асноўныя масы сялянства рашуча і бесстаротна навярнулі на шлях сацыялізму. У калгасах БССР—50 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

9 раёнаў ужо ў асноўным завяршылі сцэльную калектывізацыю. 12 раёнаў налічваюць у калгасах звыш 60 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

У другую бальшавіцкую вясну калгасы засялі 45,1 проц. яравога кліну, запяўшы рапаючае месца ў пасеве тэхнічных і працаёмкіх культур (лён ільне — 51,6 проц. усёй пасеўнай плошчы, гародніе — 54,1 проц., кормалюдах — 69.4 проц., на шматгадовых травах — 58,2 проц. і г. д.).

Значных посьпехаў дасягнулі калгасы таксама і ў галіне сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Арганізаваны 1.750 СТКФ з пагалоўем у 80.000 сьвіноматак, 12.000 МТКФ з пагалоўем у 87 тыс. дойных кароў і ПТКФ на 42.000 птушак. Усё гэта стварае моцную базу для хутчэйшага вырашэньня праблемы жывёлагадоўлі.

З ростам пасеўных плошчаў і калгаснай жывёлагадоўлі павялічыўся ўдзельная вага калгасаў у здачы (продажы) дзяржаве таварнай прадукцыі.

З такім балянсам калгасы завяршылі трэці рашаючы год пяцігодкі.

Было-б шкодным памылкай супакойвацца на дасягнутых посьпехах. Гэтыя посьпехі зьяўляюцца першапачатковымі. Вялізарныя магчымасьці, якія закладзены ў арганізацыі калектыўнай сельскай гаспадаркі, яшчэ далёка ня выкарыстаны.

Уражай у калгасах вышэйшы чым у адналічных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак па збожжавых культурах пакуль яшчэ толькі на 4,76 проц., па яравых — на 4.61 проц.

Плян камплектаваньня СТКФ на 29 сьнежня выканан толькі на 80%. Слаба праходзіць арганізацыя фэрм па гадоўлі маладняка (цялят). На фэрмах пастаўлена толькі 37.810 цялят, або 37,8 проц. гадавога пляну.

Бальшавіцкая барацьба за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў — цэнтральную задачу дапага этапу калгаснага будаўніцтва — асноўная ўмова ліквідацыі недахопаў, адставаньня.

Практыка мінулага году навочна паказвае, што адной з асноўных прычын нізкіх якасных паказальнікаў вытвораньня працы. Паводле няпоўных вестак, на вёзьдельшчыну перайшло толькі 86,7 проц. калгасаў. Калі большыня здавальняюча зьдзельшчына ўкаранена на палявых работах, дык у галіне жывёлагадоўлі яна толькі пачынае ўводзіцца. Абязьлічка і ўраўнілаўка, якія існуюць у частцы калгасаў, зьнижаюць таварнасьць сельскай гаспадаркі.

Галоўнейшымі і найбольш пашыранымі недахопамі і скажэньнямі ў галіне арганізацыі працы былі — няправільная расстаноўка сіл і скарыстаньне сродкаў вытворчасьці, арганізацыя брыгад не па вытворчым прынцыпе, а тэрытарыяльным, фармальны пераход на вёзьдельшчыну, наяўнасьць абязьлічкі, асабліва ў галіне жывёлагадоўлі, процінастаўленьне індывідуальнай вёзьдельшчыны брыгадай, пачасовы ўлік працы бяз вучоту колькасьці і якасьці выкананай работы, ураўнальнае размеркаваньне працадзён у брыгадах і г. д.

Скажэньні пры размеркаваньні ўраджаю і даходаў, ураўнілаўка, устанаўленьне норм (пайкоў) для калгаснікаў, памяншэньне непадзельных капіталаў, складаньне дутых пасеўных фондаў, недазьнка элементаў калсакрай барацьбы ўнутры калгасаў, — у значнай ступені адбіліся на выкананьні плянаў раду калгасаў па здачы таварнай прадукцыі дзяржаве. Плян загатовак па калгасах выкананы на збожжы на 96 проц., ільнасемі — на 66.8 проц. і па ільнавалакне — на 62,2 проц. Формы таксама зацягваюць здачу таварнай прадукцыі. Так, па 1 студзеня МТКФ выканалі плян здачы малака на 70 проц., а СТКФ плян здачы таварных сьвіней — толькі на 34,6 проц.

Такавы асноўныя недахопы калгасаў. Уступаючы ў новы, 1932 год, мы павінны мабілізаваць усе арганізацыі і калгасныя масы на ліквідацыю паказаных недахопаў.

У адналічнасьці з дасягнутым узроўнем калектывізацыі ў наступным годзе ўдзельная вага калгасаў па пасеве яравых будзе складаць 58-60 проц.

Партыя і ўрад паставілі перад калгасамі баявую задачу—вясной 1932 г. засеяць 200.000 гэкт. ільну, 420 тыс. гэкт. бульбы, 300 тыс. гэкт. шматгадовых і аднагадовых траў, 34 тыс. гэкт кормабулдаў, 19 тыс. гэкт. сіласных культур, 40 тыс. гэкт. гародніны і 5 тыс. гэкт. тутуню.

300 тыс. сьвіноматак і 260 тыс. таварных сьвіней, 150 тыс. дойных кароў. 86 тыс. тон таварнага малака, 562 тыс. шт. птушкі, 2 млн. яек, 320 цэнтн. таварнай птушкі, 60 тыс. трусоў — зьяўляюцца баявой праграмай у галіне вырашэньня праблемы жывёлагадоўлі шляхам арганізацыі высока-таварных калгасных фэрм.

Ня менш 90 тыс. сьвіней. 42 тыс. авечак, 1 млн. птушак павінны здаць (прадаць) дзяржаве калгасы на працягу 1932 году ў парадку калектыўнай гадоўлі.

Мы стаім напярэдадні трэцяй бальшавіцкай вясны. Цэнтральнай задачай падыходзячай веснавой кампаніі зьяўляецца барацьба за колькасныя і якасныя паказальнікі. Барацьба за ўздым ураджайнасьці, павялічэньне прадукцыйнасьці жывёлы павінна праходзіць на аснове далейшага арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Рэалізацыя 6 умоў т. Сталіна ў калгасным вытворчасьці, правільная арганізацыя працы, аўладаньне агратэхнікай, спэцыялізацыя ўсіх калгасаў, сваячасовае размеркаваньне даходу па колькасьці і якасьці працы і поўнае выкананьне абавязацельстваў перад дзяржавай — забясьпечаць далейшы рост калектыўных гаспадарак.

Рашуча змагаючыся з апартуністычнай практыкай, са стаўкай на самацёк і «левацкімі» загібамі, на аснове бальшавіцкай барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, узьнімем на вышэйшую ступень калгасную вытворчасьць і рэалізуем поўнасьцю заданьне партыі і ўраду. Сустрэнем трэцюю бальшавіцкую вясну ў поўнай гатоўнасьці!

Стрэле.

ПЕРАМОГАМІ НА ДРОВАЗАГАТОЎКАХ

СУСТРЭНЕМ XIV ЗЬЕЗД КП(б)Б

Дабіцца ўдарнай работы па вывазцы апалу

Тэмпы дровазагатовак па БССР незадавальняючыя. Заданьне чацьвертага кварталу 1931 г. выканана на 77,9 проц., гадовае — на 85,2 проц. Недапушчальна слаба ідзе вывазка дроў. Плян чацьвертага кварталу па вывазцы выканана толькі на 28,2 проц., гадавы — на 59,7 проц. Першая дэкада студзеня дала выкананьне пляну 1-га кварталу 1932 г. на 7,7 проц.

Адзе прычыны такіх чарнавых тэмпаў? Яны карэняцца ў прошай рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна на лясных работах, у слабым разгортваньні масавай работы вакол лесазагатовак, у слабым пашэсьці на кулацкія гаспадаркі, якія сабатуюць вывазку дроў, у вусім невыстарчальным адпоры кулацкай агітацыі, накіраванай на зрыў загатовак у радзе месц. У некаторых раёнах (Смалявіцкі, Старобінскі) па практыцы ажыцьцяўляецца з боку асобных арганізацый апартуністычная «тэорыя» чэргавасьці кампаній — «На сёньняшні дзень на першы плян высоўваецца збожжазагатоўкі, а на вывазку дроў калгасы ня пойдуць». (Заява начальніка старшыні Смалявіцкага РВК Ляшчука).

Пастанова ЦК і СНК БССР ад 10 сьнежня 1931 году аб безадкладным стварэньні райштабаў садзейнасьці лесазагатоўкам і вывазцы апалу многімі раёнамі ў тэрміны ня выканана. Так, Бабруйскі, Дубровенскі, Смалявіцкі, Рэчыцкі і Глускі раёны стварылі штабы толькі ў апошніх лічбах сьнежня.

Усебеларускі штаб у сваёй пастанове ад 31 сьнежня адзначыў, што «такое становішча з разгортваньнем работы райштабаў у некаторых раёнах можна тлумачыць выключна недастаткай адпаведнымі арганізацыямі гэтых раёнаў таго вялізарнага палітычна-гаспадарчага значэньня, якое зараз набывае бесьперабойнае забясьпячэньне апалам сацыялістычнай прамысловасьці».

Асноўнай перашкодай у выкананьні пляну зьяўляецца **дрэнная забясьпячэньне вывазкі неабходнай колькасьцю возчыкаў.** За апошнюю дэкаду сьнежня лік возчыкаў складаў усяго 6 проц. квартальнага заданьня. Большая частка лесгамгасаў ня мае патрэбнай колькасьці гужавой сілы. Так, **Бялыніцкі** лесгамгас за апошнюю дэкаду сьнежня быў забясьпечан возчыкамі на 0,5 проц. квартальнага заданьня, **Старобінскі** — на 1,4 проц., **Чэрыкаўскі**—на 1,5 проц. Характэрна, што гэтыя раёны плянуцца ў хвасьце па вывазцы дроў і лесу. Той жа Бялыніцкі лесгамгас квартальнае заданьне па вывазцы дроў выканаў на 6 проц., Старобінскі — на 11,7 проц.

На месцах слаба разгорнута работа па **арганізаваным наборы рабочай і гужавой сілы. Смалявіцкі** лесгамгас заданьне чацьвертага кварталу выканаў на 180 проц., на вывазцы — на 102 проц. **Магілёўскі, Заслаўскі, Веткаўскі, Капыльскі** раёны з посьпехам завяршылі выкананьне пляну лесазагатовак і вывазкі 3-га рашаючага году. Вопыт перадавікоў павінен неадкладна быць успрыняты адстаючымі раёнамі.

Толькі на аснове поўнай рэалізацыі 6 умоў **тав. Сталіна** ў рабоце лесгамгасаў, пры выстарчальным забясьпячэньні лесазагатовак і вывазкі бальшавіцкім кіраўніцтвам з боку раённых парткамітэтаў, на аснове рашучай барацьбы з апартуністамі, — можна дабіцца сапраўды ўдарных тэмпаў работы.

Рапартамі бальшавіцкіх перамог на фронце загатовак і вывазкі апалу раёны павінны сустрэць XIV зьезд КП(б)Б і XVII усесаюзную партканфэрэнцыю.

Глускі лесгамгас тармозіць вывазку

Глускі лесгамгас заданьне 4 кварталу 1931 году па загатоўках дроў выканаў на 46,3 проц., вывазкі — на 79.5 проц. Плян 1-га кварталу 1932 г. за першую дэкаду студзеня па вывазцы выканан на 2,4 проц. Рад сельсаветаў (Макавіцкі, Загальскі, Дакольскі, Слакоўскі, Хатаўскі) зрываюць вывазку дроў і лесу.

Калгас «Чырвоная Дуброва», паводле дагавору з лесгамгасам, павінен быў вывезьці 900 кбм. дроў, вывезьлі толькі 300. Калгас «Пралетары» павінен быў вывезьці 800 кбм., але да гэтага часу ня вывёз ніводнага к тру.

Макавіцкі сельсавет,—на тэрыторыі якога знаходзяцца гэтыя калгасы, ня прыняў ніякіх мер, каб прымусіць праўленьні выканаць дагавары.

Каб ліквідаваць ганебнае адставаньне ў выкананьні пляну лесазагатовак. Глускі лесгамгас у першым квартале 1932 году павінен даць ня менш, як 65 проц. гадавога заданьня. Гэтага магчыма дабіцца толькі пры ўмове ўпартага змаганьня за бальшавіцкія тэмпы работы, на аснове рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна.

Навічонак А.

АГЛЯД ДРУКУ

ФІКСАТАР і АРГАНІЗАТАР

(„КАМУНІСТ"—БАБРУЙСК, „ЧЫРВОНАЯ ПОЛАЧЧЫНА"—ПОЛАЦАК)

Павышэньне тэарытычнага ўзроўню партыйных мас і, галоўным чынам, поўнага панаўленьня радоў партыі — **актуальнейшая задача.** Трэба паўкільна і сыстэматычна ўзброіваць тэорыяй Маркса-Леніна, каб з посьпехам ажыць пяўлянь практычныя задачы сацыялістычнага будаўніцтва і непрымірыма змагацца супроць правага і «левага» апартунізму, цэнтро-рэвалюцыйнага трацкізму і гнілога лібералізму.

Марксіцка-ленінская тэорыя «дае практычнае сілу арыентаваньня, яснасьць перспэктывы, упэўненасьць у рабоце, веру ў перамогу нашай справы» (Сталін). Уздым марксыцка-ленінскага выхаваньня на вышыню сучасных задач сацыялістычнага будаўніцтва патрабуе значнага палепшэньня якасьці работы сеткі партасьветы, самага ўважлівага падбору выкладчыкаў і прапагандыстаў і сыстэматычнага кіраўніцтва работай школ і гурткоў з боку мясцовых партарганізацый.

Роля друку ў гэтай справе, як і ва ўсёй нашай рабоце, **надзвычай вялікая.**

***

Рабочая газэта «**Камуніст**» — орган Бабруйскага РК КП(б)Б — на працягу ўсёй падрыхтоўкі да заняткаў у сетцы партасьветы не зьмясьціла ні аднаго артыкулу, не дала падборкі па гэтых пытаньнях.

16 верасьня, калі пачаліся ўжо заняткі ў гарадзкой сетцы партасьветы, «Камуніст» зьмясьціў перадавіцу «Партвучобу — у цэнтр увагі». Зьмест перадавіцы носіць агульны паверхоўны характар. Ніякіх фактаў газэта не падае. Толькі мімаходам «Камуніст» санстатуе зрыў работы на курсах прапагандыстаў, не паказваючы канкрэтных вінаватых, а трафарэт па і абязьлічана абвінавачваючы «шмат якія ячэйкі КП(б)Б» у апартуністычнай недаацэнцы партвучобы.

Затым цэлых два тыдні «Камуніст» аб партыйнай вучобе наогул **не ўспамінаў.** Гэта прынесла свае рэзультаты. У зьмешчанай на старонках газэты (29 верасьня) пастанове гаркому ілюструецца цэлая сэрыя фактаў зрыву нарад, курсаў і заняткаў па партыйнай вучобе. На нараду культпропаў з 56 гарадзкіх парт'ячэек зьявіліся толькі 3 чалавекі, з 25 вясковых ячэек — 2 чалавекі. Курсы прапагандыстаў склікаліся 5 раз, аднак, так і не адбыліся.

Пастанова гаркому ўсхамянула газэту. «Камуніст», нарэшце, загаварыў аб вучобе. Але як? Ён проста зафіксаваў рад адмоўных фактаў пад загалоўкамі «Вучоба яшчэ і не пачыналася». «Партвучоба ў загоне» і г. д.

Спрод мерапрыемстваў, вызначаных у пастанове бюро РК па разгортваньні партвучобы, чытаем:

«ДЛЯ ТАГО, КАБ ПРЫКАВАЦЬ УВАГУ АКТЫВУ ДА ПЫТАНЬНЯЎ ВУЧОБЫ, АРГАНІЗАВАЦЬ ЛЕКЦЫЮ НА ТЭМУ: «ПРАВЫ ЎХІЛ НА ДАНЫМ ЭТАПЕ». ЛЕКТАРА ЗАПРАСІЦЬ З МЕНСКУ».

Нам невядома — хутка ці позна прыехаў у Бабруйск менскі лектар, не вядома ці быў ён там наогул? Ня ў гэтым справа. Справа ў тым, што «Камуніст», відавочна, усклаўшы ўсё свае надзеі на лектара, зусім кінуў займацца пытаньнем партыйнай асьветы. Пведаміўшы чытачоў 26 кастрычніка, што толькі 26 проц. складу раённай партарганізацыі ахоплена вучобай, «Камуніст» **змоўк і маўчыць** па сёньняшні дзень, апартуністычна ігнаруючы адну з важнейшых задач партыі.

***

Ня ў прыклад «Камуністу» зусім інакш пачыла да барацьбы за марксыцка-ленінскае выхаваньне «**Чырвоная Полаччына**», орган Полацкага РК КП(б)Б.

Зьмяшчаючы пастанову ЦК КП(б)Б аб разгортваньні партасьветы на новы навучальны год, «Ч. П.» у гэтым-жа нумары мабілізуе ўвагу партарганізацыі на неабходнасьць улічыць недахопы работы партсеткі, якія мелі месца ў мінулым годзе. «Чырвоная Полаччына» сыстэматычна з дэкады ў дэкаду шырока асьвятляе падрыхтоўку і ход партвучобы, выкрываючы недахопы і мабілізуючы ўвагу рабочай партарганізацыі на ліквідацыю гэтых недахопаў.

У нумары ад 5 верасьня адводзіцца паласа, прысьвечаная «**дню вучобы**». У якасьці канкрэтных задач газэта прапануе шырока прапрацаваць пытаньне партыйнай вучобы ва ўсіх ячэйках з прыцягненьнем камсамольцаў і беспартыйнага актыву, стварыць брыгады па вярбоўцы слухачоў у сетку партасьветы, арганізаваць культэстафэту, вечары партвучобы, шырока разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва і г. д.

У нумары 102 за 15 верасьня «Ч. П.» падагуліла ўжо папярэднія вынікі камплектаваньня сеткі партасьветы.

«ПАРТСЕТКА Ў ПАРАЎНАНЬНІ З МІНУЛЫМ ГОДАМ (НА ВЁСЦЫ) ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ АМАЛЬ У ТРЫ РАЗЫ. У МІНУЛЫМ ГОДЗЕ ПА РАЕНЕ БЫЛО 18 ПЕРШАПАЧАТКОВЫХ ШКОЛ, У ГЭТЫМ ГОДЗЕ БУДЗЕ ПРАЦАВАЦЬ 55 ШКОЛ З АХОПАМ ПА 30-40 СЛУХАЧОЎ У КОЖНАЙ».

У падборцы за 30 верасьня газэта выкрывае пагбайную адносіны з боку парт'ячэек штушказамбінату, хлебазаводу і ЦРК да партыйнай вучобы. Даўшы палітычную кваліфікацыю гэтым адносінам, газэта заклікае:

«ПАРТЫЙНЫЯ ЯЧЭЙКІ ПАВІННЫ З ЎСЁЙ ВЫРАЗНАСЬЦЮ АЖЫЦЬЦЯЎЛЯЦЬ ПАСТАНОВУ ЦК КП(б)Б АБ ПАРТВУЧОБЕ, У ЯКОІ (ПАСТАНОВЕ) ЯСКРАВА ВЫЗНАЧАЕЦЦА, ШТО ЗАДАЧА МАРКСЫЦКА-ЛЕНІНСКАГА ВЫХАВАНЬНЯ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ЗАДАЧАЎ УСЁЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ, ШТО КОЖНАЯ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ НЯСЕ АДКАЗНАСЬЦЬ ЗА СТАНОВІШЧА ГЭТАГА ВАЖНЕЙШАГА ВУЧАСТКУ РАБОТЫ У ТАКОЯ-ЖА МЕРЫ, ЯК І ЗА ВЫКАНАНЬНЕ РАШАЮЧЫХ ЗАДАЧ ГАСПАДАРЧАГА БУДАЎНІЦТВА».

У наступных нумарох (№№ 111, 114) «Чырвоная Полаччына» мабілізуе ўвагу на неабходнасьць забясьпечыць бесьперабойную работу ў школах партасьветы і гурткох і выкрывае недахопы ў пастаноўцы партвучобы на чытачэнным вузьле.

Побач з гэтым газэта (ад 22 кастрычніка) паказвае ўзорную работу партколектыву саўгасу «Баюнь» па разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва ў партшколах. Над падбожай аб выніках камплектаваньня сеткі партасьветы дасецца мабілізуючы аплыў—«фармальна ахапіць 100 проц. вучобай — гэта яшчэ ня ўсё: трэба дабіцца добрай якасьці ў прапрацоўцы праграм, зьнічыць прагулы і адлынаваньні ў наведваньні школ».

На працягу лістапада «Чырвоная Полаччына», асьвятляючы ход справаздачна-перавыбарчай кампаніі партарганаў, упівае гэту кампанію з задачамі марксыцка-ленінскага выхаваньня.

9-га сьнежня арганізуецца масавы дзень партыйнай вучобы, які мае сваёй мэтай мабілізаваць партарганізацыю, камсамольцаў, рабочых і калгасныя масы на пасьляховае ажыцьцяўленьне пастаноў кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б) і лістападаўскага пленуму ЦК КП(б)Б.

«Чырвоная Полаччына» ў нумары за 21 сьнежня асьвятляе работу Камвуну, падкрэсьліваючы значэньне тэарытычнай вучобы і задачу «павысіць пільнасьць да спроб працягнуць у нашу літаратуру, у нашы навучальныя ўстановы і партыйныя школы замаскаваны трацкісцкі хлам».

Апэрацыйнасьць, пастаноўка практычных пытаньняў вучобы на «прынцыповую палітычную вышыню — такі паводмак «Чырвонай Полаччыны» ў асьвятленьні задач марксыцка-ленінскага выхаваньня. У гэтым пытаньні **трэба раўняцца па «Чырвонай Полаччыне»** многім нашым раённым газэтам.

З АПОШНЯЙ ПОШТЫ

„ПАЛЕСКАЯ ПРАЎДА" ПРЫЗНАЕ СВАЕ ПАМЫЛКІ

У адказ на наш агляд «**Сон на баявым пасту**» («Зьвязда» ад 15 сьнежня 1931 г.) рэдакцыя «П. П.» зьмясьціла артыкул, у якім прызнае, што:

«ЗЬВЯЗДА» Ў СВАІМ АГЛЯДЗЕ ДРУКУ «СОН НА БАЯВЫМ ПАСТУ» ЗУСІМ ПРАВІЛЬНА КРЫТЫКУЕ НАШЫ ПАМЫЛКІ ПА МАБІЛІЗАЦЫІ МАС НА СВАЯЧАСОВЫ ПУСК МАРГАРЫНАВАГА ЗАВОДУ. АГЛЯД ДАЕ ПРАВІЛЬНЫ АНАЛІЗ ГЭТАМУ ПЫТАНЬНЮ».

«Палеская праўда» цалкам згаджаецца, што яна ў барацьбе за своячасовы пуск маргарынавага заводу дапусьціла ігнараваньне 6 умоў тав. Сталіна і ўзяла стаўку на «аб'ектыўныя» прычыны. Прызнаючы свае памылкі, асьвячаныя ў нашым агляде, рэдакцыя абяцае перабудаваць і разгарнуць найшырэйшую апэрацыйна-масавую работу вакол задач выканаьня праграмы 4-га, заключнага году пяцігодкі на аснове рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна.

І. Фэльдман

Пытаньні гаспадарчага разрахунку і банкаўскага крэдыту

Пытаньні канкрэтызацыі гаспадарчага кіраўніцтва займаюць зараз адно з цэнтральных месц у пастановах і мерапрыемствах партыі. У мінулым годзе, у прынятасьці ў другой яго палове (пасьля гістарычнай прамовы тав. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў), партыя прарабіла вялікарную работу ў галіне арганізацыйнай зьмены мэтадаў гаспадарчага кіраўніцтва, прыстасаваньня яго да новай абстаноўкі, узьнятыя гэтага кіраўніцтва на такі ўзровень, пры якім найлепшым чынам забясьпечвалася-б насыпхочае вырашэньне задач і тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Уся арганізацыйная перабудова гаспадарчага кіраўніцтва праходзіць пад кутом гледжаньня **максымальнай канкрэтызацыі і спэцыялізацыі кіраўніцтва,** пад знакам наваротку ўсёй гаспадаркі да праблемы гаспадарчага разрахунку, які гарантуе пашырэньне крыніц накаплення, выпускаваньне новых крыніц, неабходных для «захаваньня і развіцьця бальшавіцкіх тэмпаў індустрыялізацыі».

Іменна, з гэтага пункту погляду і трэба разглядаць буйныя арганізацыйныя перабудовы мінулага году: разбурэньне многіх прамысловых аб'яднаньняў, рэарганізацыю НКПС, Наркамсабу, ВСНГ і стварэньне новых спэцыяльных наркаматаў і самастойных кіраўніцтваў (лясной, лёгкай прамысловасьці, НК замежнага гандлю, Цэндтрансу і Кіраўніцтва грамадзянскай авіяцыі пры СНА). З гэтага-ж пункту погляду трэба таксама разглядаць і буйнейшыя зьмены, упесеныя ў сыстэму банкаўскага крэдытаваньня.

Гэтыя зьмены самым цесным чынам зьвязаны з задачай укараненьня гаспадарчага разрахунку і ўзмацненьня ўнутрыпрамысловага накаплення, яны проста выцякаюць з адной з пасьлядніх гістарычных умоў т. Сталіна, пад знакам якіх партыя і рабочая кляса вядуць барацьбу за высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.

Спрод прычын, якія сур'ёзна тармозілі выкананьне пляну мінулага 1931 году, нясумненна адно з галоўных месц займаюць—парушэньне прынцыпаў гаспадарчага разрахунку, абязьлічка ў карыстаньні зваротнымі сродкамі, адсутнасьць зацікаўленасьці з боку некаторых гаспадарчых органаў у фінансавых рэзультатах сваёй работы.

Гігантскі размах будаўніцтва, намечаны на 1931 год, патрабаваў вялізарных укладаньняў. Сацыялістычнае будаўніцтва нашай краіны цалкам апіраецца на пошукі внутраныя накаплення, прычым у значна большых размерах, чым у папярэднія гады. Бо «старых крыніц накаплення ўжо не хапае для далейшага разгортваньня прамысловасьці. Неабходна, значыцца, выявіць новыя крыніцы накаплення і ўзмацніць старыя, калі мы сапраўды хочам захаваць і развіць бальшавіцкія тэмпы індустрыялізацыі». (Сталін). Скажэньні ў правядзеньні крэдытнай рэформы ў мінулым стварылі ў радзе месц пагубную абязьлічку ў карыстаньні зваротнымі сродкамі (пры ўстаноўленым парадку банкаўскага крэдытаваньня гаспадарнік перастаў адрозьніваць свае сродкі ад банкаўскіх), якая правяла ў гэтых месцах да безадказнасьці і безгаспадарчасьці. Гэтыя скажэньні, апрача паказаных вышэй абязьлічкі зваротных сродкаў, характарызуюцца: па-першае, агульным крэдытаваньнем гаспадаркі пад плян, замест крэдытаваньня раальных зьдзелак, якія адлюстроўваюць фактычнае выкананьне пляну; па-другое, фактычнай ліквідацыяй дагаворных адносін паміж гаспадарчымі органамі. Іменна з гэтым зьвязана значнае адставаньне ў галіне выкананьня якасных паказальнікаў пляну. Навошта клапаціцца аб якасьці прадукцыі, калі банк за яе ўсё роўна плаціць поўным рублём. Але гэта яшчэ ня ўсё. Крэдытаваньне пад плян і «аўтаматызм» прывялі да таго, што асобныя гаспадарнікі перасталі лічыць, калькуляваць, змагацца за накаплення. «Навошта гэта, калі банк поўнасьцю пакрывае ўсе расходы».

Справа, як бачыце, ішла аб важнейшых пытаньнях нашай гаспадаркі. Гэтым і тлумачыцца рашучасьць і настойлівасьць, з якімі партыя прыступіла да зьмены практыкі крэдытаваньня, упраўляваньня фінансаваньня прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, да ўкараненьня гаспадарчага разрахунку.

Нясумненна, што адным з рашаючых мерапрыемстваў у галіне гаспадарчага разрахунку зьяўляецца пастанова ўраду аб прадстаўленьні гаспадарчым органам уласных зваротных сродкаў.

«Укараненьне ўстаноўленых партыяй прынцыпаў гаспадарчага разрахунку, — гаворыцца ў адозьве ЦК УсеКП(б) і СНК СССР ад 21 кастрычніка 1931 году—патрабавала канчатковай ліквідацыі абязьлічкі ў карыстаньні гаспадарчымі органамі ўласнымі і пазычанымі (банкаўскімі) сродкамі».

Мы ўжо вышэй указвалі, да якой безадказнасьці і безгаспадарчых адносін да фінансавых рэзультатаў работы любога гаспадарчага органу прыводзіла абязьлічка ў карыстаньні зваротнымі сродкамі. **Вызначэньне гаспадарчым органам уласных зваротных сродкаў—буйнейшы крок на шляху ўстаноўленьня жорсткай адказнасьці за пераданыя гаспадарчаму органу наштоўнасьці, за бясстратную работу.** Разьлічваць па банк цяпер гаспадарчы орган ужо ня можа. Дзяржбанк пад плян грошы не дае, страт не пакрывае і наогул не фінансуе; Дзяржбанк **крэдытуе** поўнае (абмежаванае) кола мэтаў гаспадаркі. Закон ад 23 лістапада дакладна разьмяжоўвае аб'екты, якія пакрываюцца за лік уласных зваротных сродкаў гаспадарчага органу, ад аб'ектаў, якія пакрываюцца банкаўскім крэдытаваньнем.

Абязьлічка зваротных сродкаў пазбаўляла гаспадарніка элементарнага мацаваньня сваёй сродкамі. Тая пазбаўляла яго стымулаў да ўзмацненьня накаплення, бо гэтыя апошнія цалкам ад яго адбіраліся. Уведзеньне рэжыму ўласных зваротных сродкаў значна пацьвярдзе правы гаспадарніка. Накаплення ў пераважнай сваёй частцы застаюцца ў яго распараджэньні, гаспадарчы орган набывае большую маневраздольнасьць у іх скарыстаньні. Запікаўленасьць да накаплення ўзмацняецца, г. зн. ствараецца моцная прадпасылка для вядзеньня справы на прынцыпах гаспадарчага разрахунку.

Вельмі важнае значэньне ў галіне ўкараненьня гаспадарчага разрахунку мае ператварэньне банкаўскага крэдыту ў крэдыт **зваротны і тэрміновы. Праз тэрміновасьць банкаўскага крэдыту кантроль рублём набывае сваё сапраўднае значэньне.** Устанаўліючы для гаспадарчых органаў абавязковы тэрмін звароту банкаўскага крэдыту, Дзяржбанк тым самым стымулюе паскарэньне працэсу вытворчасьці, звароту сырцу, матар'ялаў і гатовых тавараў, перашкаджае лішняму (звышпланаваму) накапленьню матар'яльных каштоўнасьцяй і іх замаражваньню. Карацей гаворачы, банк праз тэрміновасьць крэдыту пачынае па-сапраўднаму ўжываць кантроль рублём за ходам выкананьня пляновых заданьняў.

Сур'ёзным тормазам у справе больш хуткага і канчатковага пераходу банку ад мэтадаў фінансаваньня да сыстэмы банкаўскага крэдытаваньня пасобных гаспадарчых органаў, зьяўляецца слабасьць банкаўскай сыстэмы на пэрыферыі. Крэдытаваньне без папярэдняга вывучэньня аб'ектаў крэдыту, выдача грошай пад голую давежку—усё гэта яшчэ пакуль, на жаль нярэдкае зьявішча ў практыцы банку. **Рашуча і ў бліжайшы тэрмін выкіць гэтыя недахопы—наша першачарговая і важнейшая задача.**

Наступнае буйнейшае мерапрыемства ў галіне ўкараненьня гаспадарчага разрахунку — **аднаўленьне сыстэмы дагаворных адносін паміж гаспадарчымі органамі.** Вышэй мы ўжо паказвалі, да чаго прыводзіла страта дагаворнай сувязі паміж пастаўшчыком і пакупнікам. Трэба падкрэсьліць, што гэты факт (ліквідацыя дагаворных адносін) вельмі адмоўна адбіваўся на гаспадарцы. Забываючы асобнымі гаспадарнікамі сваіх абавязкаў па частцы якасьці прадукцыі, па сабекошту, безадказнасьць ў своячасовай адгрузцы выробленых тавараў — усё гэта ў значнай сваёй частцы вынік ліквідацыі сыстэмы дагаворў паміж гаспадарчымі органамі.

Аднавіўшы дагавор, мы, здолелі ў гэтай галіне дабіцца значных посьпехаў. Гаспадарчая сувязь паміж гаспадарчымі органамі ўстанаўляецца дагаворам. Апошні паступова становіцца сродкам кантролю пастаўшчыка з боку пакупніка і наадварот. А кантраляваць пастаўшчыка па лініі якасьці, асартыменту, сабекошту, своячасовай адгрузкі і інш.—т. зн. адначасова стымуляваць, штурхаць пастаўшчыка да выкананьня даных яму пляновых, на аснове якіх ён і заключаў дагаворы са сваімі пакупнікамі.

Адначасова з дасягнутым пераломам на гэтым важнейшым вучастку, мы маем яшчэ буйнейшыя недахопы, якія ў 1932 годзе павінны быць зжыты поўнасьцю.

«Асаблівае значэньне (для вырашэньня гаспадарчых задач 1932 г.)— заявіў тав. **Молатаў** на 2-й сэсіі ЦВК СССР—набывае практыка дагаворных адносін. І з пункту гледжаньня замаляваньня прыпятых намі гаспадарчых пляноў, на аснове цьвёрдых адносін паміж гаспадарчымі арганізацыямі, і з пункту гледжаньня ўмацаваньня гаспадарчага разрахунку ў нашых прадпрыемствах і гаспадарчых арганізацыях дагаворы павінны заняць важнейшае месца ў нашай рабоце ў будучым годзе».

Між тым пастанова СНК Саюзу ад 17 сьнежня 1931 г., якая абавязвала гаспадарчыя органы скончыць заключэньне генэральных дагаворў на 1932 год не пазьней 10 студзеня, а заключэньне лёкальных і простых дагаворў не пазьней 20 студзеня выконваецца зусім незадавальняюча. Нашы беларускія арганізацыі да заключэньня дагаворў у большасьці не прыступілі. Становішча зусім ненармальнае.

Мінулы год у дагаворнай практыцы багаты шматлікімі фактамі грубага скажэньня дагаворных адносін, якое даходзіла ў пасобных выпадках да сьвядомай падмены сутнасьці дагавору голай формай. Дзяржбанку вядомы рад фактаў, калі некаторыя гаспадарнікі заключалі паміж сабой дагаворы не для выкананьня ўзаемных абавязацельстваў і не для парматнага забясьпячэньня выкананьня сваіх вытворчых або гандлёвых пляноў, а выключна для прадстаўленьня дагавору ў Дзяржбанк з мэтай атрыманьня крэдытаў. Ня цяжка зразумець, што такія дагаворы, заключаныя выключна для «задавальненьня патрэб банку», па сутнасьці справы ня мелі ў сябе ніякіх канкрэтных абавязацельстваў і таму ўяўлялі сабой фармальныя паперкі.

Ні лепш абстаіць справа часта і з выкананьнем дагавораў, хаця-б і правільна складзеных. Умовы якасьці, асартыменту, часу адгрузкі рэдка калі выконваюцца цалкам. Спагнаньне няўстойкі, пені, як і наогул прыцягненьне да адказнасьці арганізацыі, якая парушыла дагаворы, зьявішча вельмі рэдкае. Усё гэта памінула пазбаўляе дагавор яго сапраўднага значэньня, як вагара, пры дапамозе якога бакі ўзаемна кантралююць адзін аднаго, забясьпечваецца нармальны таваразваротаі г. д.

Зусім неабходна ўжо з самага-ж пачатку кампаніі па заключэньні дагаворў па 1932 год абавязкова перагледзець іх **якасьць.** З асаблівай настойлівасьцю трэба дабіцца, каб дагаворы заключалі ў сябе максымальна канкрэтныя абавязацельствы бакоў, каб поўнасьцю прадугледвалася матар'яльная адказнасьць органу, які парушыў дагавор.

Правільна праводзіць дырэктывы партыі ў галіне крэдытаваньня—гэта ў першую чаргу рашуча ажыцьцяўляць прынцыпы простага банкаўскага крэдытаваньня і бязьлітасна змагацца з камэрцыйным крэдытаваньнем, як формай пяляпнуцца разьмеркаваньня сродкаў у гаспадарцы. Парушэньне гэтага прынцыпу, нарэшце, прыводзіць да грубейшых парушэньняў мэтадаў гаспадарча-разрахунковай работы, размеркаваньню сродкаў у адпаведнасьці з гаспадарчымі плянамі супро

БАЛЬШАВІЦКАЯ ПРЭСА—АРГАНІЗАТАР САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА

Буржуазная прэса—зброя барбарскай эксплёатацыі, хлусьні, ашуканства працоўных, падрыхтоўкі інтэрвэнцыі

ВЫСТУПЛЕНЬНЕ тав. УМАНСКАГА НА КАНФЭРЭНЦЫІ ДРУКУ У КАПЭНГАГЕНЕ

БЭРЛІН, 13. Як паведамляюць з Капэнгагену, на **канфэрэнцыі загадчыкаў аддзеламіі друку міністэрстваў замежных спраў і дырэктараў тэлеграфных агенцтваў** разгарнуліся спрэчкі аб барацьбе з «іжывымі паведамленьнямі ў друку, што пагражаюць справе міру». На гэтым пытаньні даклад рабіў польскі дэлегат. Паводле слоў кіраўніка латвійскага аддзелу друку Більмана, латвійскаму міністэрству замежных спраў **ня раз** прыходілася мець справу з фактам папырэньня **з Рыгі іжывых паведамленьняў**, якія мелі мэтай падарваць прыяцельскія адносіны Латвіі з суседнімі дзяржавамі. Аўтарамі гэтых паведамленьняў былі, як зазначыў Більман, розныя цёмныя асобы.

Рад прамоўцаў падкрэсьлілі, што на канфэрэнцыі належаць абгаварэньню толькі тэхнічныя, а не палітычныя пытаньні. Савецкі дэлегат **Уманскі** ўказаў, што пытаньне аб барацьбе з іжывымі паведамленьнямі надзвычай цікавіць СССР, бо ні **ў сусьветнай гісторыі, ні ў гісторыі прэсы ня было выпадкаў такіх настойлівых кампаній хлусьні, паклёпу і фальсыфікацыі, якія мелі месца супроць СССР за 15 год яго існаваньня.** Кампаніі гэтыя нас не зьдзіўляюць, сказаў Уманскі,— бо заўсёды, калі толькі ў гісторыі адзін сацыяльна-эканамічны лад зьмяняўся другім, то ў іншых краінах, дзе захоўваўся стары парадак, кіруючыя колы сумесна з рэшткамі скінутага ў рэвалюцыйнай краіне рэжыму атакоўвалі, у прыватнасьці і мэтадамі паклёпу на краіну рэвалюцыі. Уманскі прывёў прыклады з газэтных кампаній супроць Вялікай Францускай рэвалюцыі, супроць амэрыканскай барацьбы за незалежнасьць. Даў дэтальны агляд розных відаў кампаній іжы і фальшывак у розныя пэрыяды існаваньня савецкай улады і, перайшоўшы да некаторых выдумак і кампаній самага апошняга часу, спыніўся, у прыватнасьці, на паведамленьнях аб мнімым падтрыманьні Савецкім Саюзам аднаго з праціўнікаў у далёка-ўсходнім канфлікце, падкрэсьліваючы, што гэтыя паведамленьні пашыраліся з мэтай уцягнуць СССР у канфлікт.

Савецкі дэлегат адзначыў, што хаця ў краінах, дзе распускалася гэтая выдумка, было відома на аснове афіцыяльнай інфармацыі прадстаўнікоў гэтых краін, што паведамленьні выдуманы і, ня гледзячы на тое, што зацікаўлены ўрад сам заявіў, што ні верыць гэтым паведамленьням,—ні адно афіцыяльнае бюро друку ня выступала з абвержэньнем гэтых паведамленьняў, якія абышлі тым часам сусьветны друк.

Далей, Уманскі ўспомніў аб кампаніі тэрэнцыйных паведамленьняў і фальсыфікацый, накіраваных супроць перагавораў аб пактах ненападу, што адбываліся паміж СССР і радам краін. Выступленьні мэтадамі хлусьні і падтасоўкі супроць актаў, што праслядуюць мэты міру, зьяўляюцца ні чым іншым, як выступленьнямі супроць міру, прапагандай ідэі нападу.

Далей, Уманскі ўказаў на неабходнасьць памятаць, што роля прэсы павінна быць: прадметам практычнага абгаварэньня канфэрэнцыі, якая засядае ў момант, калі ў сувязі з далёка-ўсходнімі падзеямі **пяро журналістаў зноў яраз расчышчала шлях штыку.** Супроць падобных выступленьняў прэсы кіраўнікі аддзелаў друку павінны былі-б актыўна змагацца, паколькі ўрады, якім падначалены кіраўнікі аддзелаў друку, як быццам адмовіліся ў міжнародных актах звярачацца да народаў. На магчымыя спасылкі на так званую свабоду друку ў капіталістычных краінах можна толькі запярэчыць, — сказаў Уманскі, — што паводле нашага перакананьня **адзінай краінай, дзе вялізарная працоўная большасьць насельніцтва карыстаецца самай шырокай сапраўднай свабодай друку, зьяўляецца СССР.**

Потым савецкі дэлегат указаў на актыўную ролю савецкага друку ў сацыялістычным будаўніцтве і ў падтрыманьні мірнай палітыкі савецкага ўраду.

Наўрад ці знойдзецца зараз хаця-б адна капіталістычная краіна, — гаворыць далей Уманскі, — у якой фармальная «свабода друку», гарантаваная канстытуцыяй, ня была-б парушана бязглуздымі прасьледваньнямі. Замест сапраўднай барацьбы з пагражаючай сьвету інфармацыяй, частка прэсы па данай канфэрэнцыі і па папярэдніх ёй нарадах абаранялася глыбока супярэчлівую канцэпцыю: спачатку заяўляюць, што прэса—шостая дзяржава, ад якое залежаць вайна і мір, затым канстатуюць, што частка прэсы пашырае паведамленьні, якія могуць пагражаць міру, далей заяўляюць, што «свабода друку» вышэй за ўсё і, нарэшце, што патрабуецца «маральнае раззбраеньне», у прыватнасьці па лініі прэсы з тым, каб яна не займалася агрэсыўнай прапагандай, супроць якое, аднак, нельга выступаць у сілу тэй-жа «свабоды друку».

Але адначасова савецкі дэлегат заклікаў канфэрэнцыю зрабіць практычную спробу хаця-б часткова абясшкодзіць выступленьні тэй часткі прэсы, якая адкрыта рыхтуе напады і інтэрвэнцыі і карыстанца для гэтага мэтадамі фальсыфікацыі і хлусьні. (ТАСС).

За аўладаньне тэхнікай!

Закрыўся першы ўсебеларускі зьезд рацыяналізатараў і вынаходцаў

Усебеларускі зьезд рацыяналізатараў і вынаходцаў, які толькі што закончыўся, набывае выключна важнае значэньне ў справе разгортваньня сацыялістычнай рацыяналізацыі прамысловасьці, барацьбы за выкананьне якасных паказальнікаў, у справе ажыцьцяўленьня ўказаньняў тав. Сталіна аб аўладаньні тэхнікай.

Асноўным дакладам па зьезьдзе зьявіўся даклад члена прэзыдыуму ЦСПСБ тав. **Каменштэйна** аб ролі і задачах рабочага вынаходніцтва і рацыяналізацыі ў рэканструкцыйны пэрыяд.

— Прамова тав. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў — кажа тав. Каменштэйн,—выклікала вялізарнейшы энтузіязм шырокіх працоўных мас у справе вынаходніцтва і рацыяналізацыі сацыялістычнай прамысловасьці. У гэтай галіне работы мы ўжо маем значныя посьпехі. Па прамысловасьці ВСНГБ у першым квартале 1931 г. было ўнесена 2205 рабочых прапаноў, у другім—1945 і ў трэцім—2245. Сума эканоміі, атрыманай ад рацыяналізатарскіх прапаноў, складае звыш 1 млн. руб. Ня менш дасягненьняў мы маем і ў галіне вынаходніцтва. Надзвычай каштоўныя вынаходкі далі рабочы **Сарокін** (машына для абточкі варыятатаў), тэхнік **Кільчэўскі** (праект канструкцыі стандартнага дому), рабочыя **Фіш** і **Аблаўмец** вынайшлі машыну для швэйных фабрык, інжынэр **Цыпэровіч** сканструяваў печ для вымальваньня торфу, мэханік **Гурло** палепшыў канструкцыю імпартных закройных машын і г. д.

Аднак, рабочае вынаходніцтва на радзе прадпрыемстваў усё яшчэ разьвіта нездавальняюча. Прынятыя прапановы часта рэалізуюцца чарапашымі тэмпамі. У радзе месц слаба арганізавана пастаянная дапамога рабочым вынаходцам, зусім дрэнна пастаўлена вынаходніцкая справа ў сацыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі.

З другім дакладам аб ажыцьцяўленьні рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў па прамысловасьці ВСНГБ і пляне рацыяналізацыі на 1932 г. выступіла тав. **Русановіч.**

За 9 месяцаў 1931 году пляны па рабочых прапановах выкананы на 67,7 проц. 1.343 прынятыя прапановы не рэалізаваны, слаба пастаўлена дапамога рабочым-вынаходцам у тэхнічным афармленьні іх творчай думкі. Пастанова зьезду рацыяналізатараў аб арганізацыі экспэрымэнтальных майстэрань пры кожным прадпрыемстве выкалана зусім нездавальняюча. З 187 прадпрыемстваў экспэрымэнтальныя майстэрні маюць толькі 10. У 1932 г. мяркуецца атрымаць эканоміі ад рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў 14.600 тыс. руб.—больш чым у 2 разы супроць 1931 г.

Даклады т. т. Каменштэйна і Русановіч былі дапоўнены выступленьнямі дэлегатаў зьезду, якія далі разгорнутую карціну становішча рацыяналізатарскай справы на месцах. У сваіх выступленьнях дэлегаты дэманстравалі посьпехі вынаходзтва на прадпрыемствах. На Аршанскім чыгуначным вузле за адзін месяц сабрана 300 прапаноў замест 200 паводле заданьня—плян выкананы на 150 проц. Гомельскі чыгуначны вузел у 1931 г. даў 800 рабочых прапаноў. Адзін толькі рабочы - чыгуначнік **Еўстаф'еў** прапанаваў 50 каштоўнейшых вынаходак. На Віцебскай акулярнай фабрыцы рэалізацыя 304 рабочых прапаноў дала 12.344 руб. эканоміі. Рабочы заводу імя Варашылава тав. **Лапідус** вынайшоў бязгірпую вагу. Гэта вынаходзтва мае сусьветнае значэньне.

Усё гэта сьведчыць аб вялізарным творчым энтузіязме рабочай клясы, накіраваным на барацьбу за эканамічную незалежнасьць, на хутчэйшую пабудову сацыялізму ў нашай краіне.

Але разам з гэтым дэлегаты ўказалі на рад фактаў бюракратычна-бяздушных адносін з боку асобных гаспадарнікаў і арганізацый да рэалізацыі рабочых прапаноў і вынаходак.

— Мною ў 1931 г. вынайдзен прыбор—сіфон для паравозу, — расказвае аршанскі чыгуначнік тав. **Азарэвіч.** —Праект гэтага прыбору я дэманстраваў у розных установах ледзь не два гады, ніхто не згаджаўся зрабіць мадэль. Прышлося зрабіць яе саматужным спосабам. Пакуль гэты прыбор паставілі на выпрабаваньне, прайшло 4-5 месяцаў. З маім сіфонам зрабілі 6 паездак, а са звычайным—толькі 4 паезкі. Вынаходка дае 26 проц. эканоміі вугальнага апалу. Здавалася-б, што гэтым пытаньнем павінны зацікавіцца ўсе арганізацыі, але ўжо прайшло 6 месяцаў, і я пакуль што не атрымаў ніякіх вынікаў.

Гомельскі рабочы **Еўстаф'еў** вынайшоў прыбор для прадзьмухваньня дымагарных труб у паравозах. Гэты прыбор мясцовай камісіяй быў ня прынят. Калі вынаходка была паслана ў НКПШ, апошні дазволіў зрабіць вопыт. Ня гледзячы на тое, што вопыт даказаў усю прыгоднасьць прыбору, ДАРУЗУ яго ня прыняў.

— Зрабіў я і другі прыбор,—расказвае тав. Еўстаф'еў, каб адразу дзьве рэйкі паднімаць, падаў яго ў камісію. Адна камісія ўхваліла, другая таксама, але трэцяя знайшла, што прыбор нікуды ня варты. Паслаў у ДАРУЗУ і там адразу адхілілі, але праз некаторы час, гляджу, прысылаюць 50 руб. прэміі. Добра, што знайшоўся чалавек, які ацаніў маю работу і каштоўнасьць прыбору.

Характэрным зьяўляецца выступленьне работага Віцебскай фабрыкі «Чырвоны тэкстыльшчык» тав. **Грэка.**

— Вялікім недахопам зьяўляецца тое, што на многіх складаных машынах дагэтуль яшчэ ўжываюцца імпартныя дэталі. Я працую мэханікам тэкстыльнай фабрыкі. Дзякуючы вынаходкам мне ўдалося паступова замяніць усе імпартныя часткі складаных машын, за выключэньнем шпэйнай голкі. Нам трэба ўсім падумаць над **вызваленьнем машын ад імпартных дэталяй** і старацца абсталяваць усе часткі ў нас на месцы.

У заключным слове тав. **Каменштэйн** адзначыў, што вынаходныя ячэйкі на заводах і фабрыках агульнымі сіламі павінны змагацца з коснасьцю, цяганінай і бюракратызмам у адносінах да рэалізацыі рабочых прапаноў і вынаходак, якія (адносіны) яшчэ маюць месца на радзе прадпрыемстваў.

Зьезд выбраў кіруючы орган—Цэнтральны Савет таварыства вынаходнікаў і ўзяў на сябе абавязак—**у падарунак XIV зьезду КП(б)Б даць ня менш 500 рабочых прапаноў.**

Учора адкрыліся II менская партканфэрэнцыя і X партканфэрэнцыя БВА

II-я МЕНСКАЯ

Учора, у 6 гадз., у памяшканьні Дому Камасьветы, адкрылася II менская партыйная канфэрэнцыя.

Адкрываючы канфэрэнцыю, сакратар гаркому КП(б)Б **тав. Кавальчук** у сваім уступным слове ахарактарызаваў работу партарганізацыі за справаздачны пэрыяд, і вызначыў задачы канфэрэнцыі.

У прэзыдыум канфэрэнцыі выбрана 67 чалавек. Сярод іх—т. т. **Гей, Шаранговіч, Галадзед, Калінін, Кавальчук, Убарэвіч, Аранштам, Матсон, Іваноў, Рыскін, Гантман, Шпэктараў, Чарвякоў, Кеніг, Гарын, Палякоў, Геллер, Рахкінд, Тарасэвіч** і інш.

Канфэрэнцыя выбрала сакратарыят у колькасьці 15 асоб, мандатную камісію з 13 асоб, і рэдкалегію з 11 асоб.

Пад бурныя воплескі канфэрэнцыі выбірае ў ганаровы прэзыдыум **Палітбюро ЦК УсеКП(б) і т. т. Рудзутака, Тальмана, Ленскага, Корчыка.**

З дакладам ЦК ПК(б)Б выступіў **тав. ГЕЙ.**

X ПАРТКАНФЭРЭНЦЫЯ БВА

Учора вечарам, у вялікай залі клюбу імя Сталіна, адкрылася дзесятая партыйная канфэрэнцыя Беларускай Вайсковай Акругі.

Начальнік ПУАКР тав. АРАНШТАМ, адкрываючы канфэрэнцыю, **указаў на гістарычныя перамогі, якіх дасягнула рабочая кляса Савецкага Саюзу пад кіраўніцтвам ленінскай партыі.**

— Канфэрэнцыя будзе праводзіць свае работы ва ўмовах, — гаворыць тав. Аранштам, — калі пралетарыят, у саюзе з налгасным селянствам, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, пераможна закончыў пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі, з посьпехам выканалі пляны 3-га рашаючага году і ўступілі ў чацьверты, заключны год пяцігодкі.

У сувязі з тым, што канфэрэнцыя пачынае свае работы напярэдадні ленінскіх дзён, тав. Аранштам завастрае ўвагу дэлегатаў на выкананьне ленінскіх заветаў аб узмацненьні Чырво-най арміі, не баяздольнасьці, на задачах камуністаў — работнікаў Чырвонай арміі.

Канфэрэнцыяй выбран прэзыдыум у складзе 35 асоб. У прэзыдыум увайшлі т. т. ГЕЙ, ШАРАНГОВІЧ, УБАРЭВІЧ (нач. РВС БВА), РУМЯНЦАЎ (сакратар Абласткому Заходняй вобласьці), АРАНШТАМ, ГАЛАДЗЕД, КАЛІНІН і інш.

Канфэрэнцыя выбрала дэлегацыю для прывітаньня Менскай гарадзкой партыйнай канфэрэнцыі, якая сёньня распачала свае работы.

Канфэрэнцыяй пасланы прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б), ПУР, ЦК КП(б)Б, Абласткому Заходняй вобласьці, Смаленскай, Гомельскай і Віцебскай партыйным канфэрэнцыям.

Потым з вялікім дакладам аб рабоце ПУАКР'а выступіў тав. АРАНШТАМ.

Паведамленьні

— Усім таварышам, выезджаным РК і ГК на 10-дзённыя курсы кансультантаў, своячасова зьявіцца ў Мінск да 20-1—32 г. і захапіць з сабой пасьцельныя прылады. Інтэрнатам і харчаваньнем будуць забясьпечаны.

— Культпроп гаркому КП(б)Б паведамляе ўсе партколектывы гарадзкіх, што пры вылучэньні таварышоў на курсы ліквідатара парт. і камсамольскага актыву трэба мець на ўвазе, дзе вылучаны тав. вучыцца і ні ў якім разе не адрываць яго ад вучобы вытрэйнга Камвузу.

— Гарпрафсавэтам, гарадскім камітэтам саюзу працасьветы і гарана склікаецца на 16-1—32 г. у 7 гадзін вечара, у памяшканьні клюбу асьветы (Камуністычная, 19) зьезд культармейцаў, прысьвечаны падрыхтоўцы да XIV зьезду КП(б)Б і XVII канфэрэнцыі УсеКП(б).

Парадак дня: 1. Даклад НКА і даклад Гарана аб культбудаўніцтве ў 1931 і 1932 годзе. 2. Рамарты прадпрыемстваў і культасьветных установаў. 3. Прэміраваньне. 4. Мастацкая частка. Запрашаюцца ўсе настаўнікі і рабочыя ўдарнікі з прадпрыемстваў.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Пяць год са дня разгрому Грамады

СТАРА-БЕРАЗОЎСКІЯ ПАДЗЕІ

(Успаміны былога пасла МЯТЛЫ.

З ростам Грамады ўзмацняўся і тэрор адміністрацыі супроць гурткоў, а таксама супроць пасобных дзеячоў—грамадаўцаў. Амаль кожны сход або нарада ці адбывалася без правакацыі, авантуры, якую наладжвалі надаслаными паліцыяй шпікі, або пераапранутыя паліцэйскія. Буржуазная прэса на чале з манархічнай газэтай «Слово»—органам заходня-беларускіх абшарнікаў, увяла спэцыяльныя аддзелы, у якіх зьмяшчаліся артыкулы падбухторваньня, паклёпаў і самай агіднай брахні супроць нашай арганізацыі. Натуральна, усё гэта рабілася выключна дзеля таго, каб падрыхтаваць грунт для разгрому Грамады, падрыхтаваць буржуазную «апінію» і адначасова, каб справакаваць грамадаўцаў на неарганізаванае выступленьне супроць паліцыі і тым самым мець прычэпку для «законнай» ліквідацыі Грамады.

НА ЗДЫМКУ: Былы пасол беларускага рабоча-сялянскага клюбу «Змаганьне», зьбіты фашысцкімі бандытамі, засуджены на 8 год катаргі. Зараз знаходзіцца ў турме.

Ужо ў лістападзе месяцы ня было ні аднаго зьезду, сходу, або мітынгу, дзе-б фашысцкія шпікі пад кіраўніцтвам паліцыі не нападалі на членаў Грамады, не стараліся-б іх справакаваць, або запалохаць тэрорам.

Самым яркім прыкладам агіднай правакацыі паліцэйскіх банд пад кіраўніцтвам нам. старосты Бельскага павету і капэндранта павятовай паліцыі, быў напад на зьезд членаў Грамады ў **вёсцы Стара-Бярозава**, Бельскага павету.

Уже самі факт вызначэньня на зьезд вёскі, якая знаходзіцца ў глухім кутку Бельчыцкіх, за 11 кілёмэтраў ад чыгуначнай станцыі Гайнаўка, гаворыць аб тым, што справа нападу была абдумана і падрыхтавана наперад.

Для правядзеньня зьезду вызначаны былі я і тав. Валошын, які яшчэ і зараз знаходзіцца ў Равіцкай турме.

Вечарам 4-га сьнежня выехалі з Вільні. А другой раніцы ўначы прыяжджаем у Гайнаўку.

Глухая ноч. Першы сьнег белай пялёнкай засклаў дарогу і поле. Гурбой накіроўваемся ў м. Гайнаўку. Некалькі падазроных тыпаў прабавалі было круціцца каля нас, але бачачы здаровых, маладых хлапцоў, узброеных кімі, параўнялі пакінуць нас у спакоі. Не вялікая хата Ваўчка (старшыні гайнаўскага гуртка) набіта паўнюсенька людзьмі. Некаторыя напрыходзілі здалёка. Перакідваемся адарванымі сказамі.

Чуць сьвет выехалі з Гайнаўкі. Праз дзьве гадзіны даяжджаем да Стара-Бярозава. Па дарогах бачым рух: грамадаўцы ідуць на сход. Пры ўезьдзе ў вёску засеў у балота грузавы аўтамабіль. Кучка «цывільных» каля 40 чал. капошыцца ля загрузшага аўтамабіля. Па вуліцы разьяжджаюць атрады конпай паліцыі. Каля хаты, дзе павінен адбыцца зьезд, а таксама і ля школы, дзе спыніўся нам. старосты і камэндант паліцыі,—атрады пешай паліцыі. Апрача таго, пры ўезьдзе ў вёску на кожнай вуліцы стаяць паліцэйскія і пастаўлена па адным кулямёце. Па прыблізным падліку толькі ў самай вёсцы было каля 100 паліцэйскіх.

На зьезд пачалі зьбірацца грамадаўцы. Большасьць арыштоўваліся пры ўезьдзе ў вёску і саджаліся ў канцовыя хаты. Партыйныя білеты ад іх адбіралі і перадавалі тым «цывільным», якіх мы бачылі пры аўтамабілі, і якія, як высьветлілася, спэцыяльна былі прывезены разам с паліцыяй з Гайнаўкі на зьезд. Частка таварышоў усё-ж такі змагла прабрацца гарадамі ды сьцежкамі, якіх ня ведала паліцыя.

Разам з тав. Валошыным ідзем у школу да старосты, каб пратэставаць супроць гвалту, пратэставаць супроць незаконнага арышту членаў Грамады. Староста арышт тлумачыць тым, што нібыта арыштаваныя ня мелі дакумантаў і ніхто ня мог сьцьвердзіць іх асабістасьці. На нашу заяву, што сярод арыштаваных ёсьць і члены Грамады з тутэйшай вёскі, якіх ведае солтыс, староста адказаў, што ён «обадае».

Натуральна нікога з арыштаваных на зьезд ня выпусьцілі і мы вярнуліся назад ні з чым. Яна было адно, што для нас рыхтуецца крывавая лазня. Ня гледзячы на тэрор і арышты, усё-ж такі прабралася на зьезд каля 150 чал. Новая сялянская хата паўнюсенька. Дзьверы зачыненыя і падпёртыя багатырскімі сьпінамі хлапцоў. На дварэ банда шпікаў, якіх ня пусьцілі па зьезд, а за імі па вуліцы больш 40 пешых паліцэйскіх.

Адкрываю зьезд. Першае слова даю т. Валошыну. Не пасьпеў ён сказаць і некалькіх слоў як падняўся дзікі гвалт і ў хату праз вокны палецелі каменьні, бутэлькі, палкі і г. д. Усё гэта адбылося на вачох паліцыі. Некалькі таварышоў паранены. Патрабуем ад старосты спыніць гвалты і арыштаваць бандытаў. Староста і камэндант выходзяць на вуліцу, як быццам за тым, каб даць належнае распараджэньне.

Пасьля выхаду «начальства», мы зноў забарыкадавалі дзьверы. Выцьцё апалелай банды павялічылася. У хаце ніводнага цэлага вакна. Лік параненых у нас усё больш павялічваўся. Трэба было пента рабіць, бо бачым, што ў дапамогу бандзе прышла паліцыя. Кожнага нашага таварыша, які праба ваў праз вакно выплянуць — сяклі **шаблямі.** Пасеклі некалькі ваконных рам. Нарэшце, пешая паліцыя ўрываецца праз другія дзьверы, і напала на нас, б'ючы прыкладамі і лаючыся так, як можа толькі лаяцца апалелы польскі пан.

Выхаду ня было. Трэба было прарывацца і разыходзіцца, бо ўступаць у бой з узброенай паліцыяй, якая нават лічбова нас перавышала, ня было магчымасьці.

Нечакана для шпікаў адчыняем дзьверы і цэлай масай налятаем на бандытаў, мнём іх пад нагамі і рассыпаемся ў розныя бакі. Натуральна, што пры гэтай аказіі хлопцы выкарысталі свае кі на 100 проц., так што амаль кожны шпік, які папаўся пад ногі, папоў да хаты з добрай адзнакай.

Пачалася дзікая пагоня конпай паліцыі з голымі шаблямі ў руках за грамадаўцамі. Удары сыплюцца за ўда рамі. Няма ўжо амаль ні аднаго таварыша, які ня быў-бы паранены. Ня гледзячы, што кроў заліває твар, я іду да старосты і патрабую, каб ён забараніў крывавую расправу над безабаронными сялянамі, але сустракаю цынічны адказ.

Тут трэба адзначыць вельмі характэрны выпадак. Разам са мной прышоў да старосты акрывавулены шпік. Ён паказваючы сваю пакалечаную галаву плаксівым голасам заявіў: «Пане старосьце шпацеж мовілі, жэ ніц не бэндзе, а тым часэм за тэ шпэклентэ дзьве злотувкі так мне побіто». Гэты выпадак яшчэ больш пераканаў, што разгром быў арганізаваны самым старостаю і камэндантам паліцыі.

Прыпоўны назад, я з т. Валошыным і з т. Трашчоткай — гаспадаром хаты, сталі падлічваць страты, каб хоць частку зьвярнуць пацярпеўшаму.

У гэты час на выпаўшага ў другі пакой т. Валошына зноў напала банда і пачала яго біць. Чалавек пяць накінулася на мяне, але я пасьпеў выхапіць з кішэні браўнінг і пачаў страляць. Бандыты кінуліся наўцёкі, але па іх месцы ўбеглі бандыты ў форме — паліцыя. На мой адказ, што страляў я, яны акружылі мяне, схапілі за рукі і пачалі біць прыкладамі па галаве. Акрываўлены я страціў прытомнасьць і ўпаў.

Прывялі ў чуласьць нас сяляне з вёскі, яны-ж далі нам фурманку і адвезьлі ў Гайнаўку. Ня гледзячы на наш пратэст, паліцэйскія бандыты ехалі за намі, за нашай фурманкай аж у Гайнаўку.

На трэці дзень пасьля нападу выслана была спэцыяльная камісія ад Грамады, якая пацьвердзіла, **што напад быў арганізаваны паліцыяй па за гаду старосты і што карысталіся пры гэтым шпікамі (галоўным чынам членамі ППС і балахоўцамі), якіх спэцыяльна прывезьлі на грузавых аўтамабілях з Гайнаўкі.**

Сярод набітых у вёсцы сялян, было шмат жанчын і нават адзін глуханям, брат Трашчоткі, які нічога не разумеў, што і для чаго робіцца.

За тое, што таварыш Ваўчык сустрэў нас і даў магчымасьць спыніцца ў яго, тая-ж самая банда ноччу пасьля зьезду напала на яго дом. **Сам гаспадар быў зьбіты да страты прытомнасьці, а 8-месячнае дзіцё схоплена было за ногі і выкінута за вакно. Усе рэчы, што знаходзіліся ў хаце, былі зьнішчаны.** Так распраўляюцца фашысцкія каты з тымі, што ня толькі прымаюць удзел, а нават спачуваюць рэвалюцыйна-вызваленчаму руху.

Як фінал гэтай справы, трэба адзначыць расправу над сьпецыяльнай інтэрпаляцыяй паслоў Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады і іншых клюбаў, калі пасол Балін кінуў акрываўленую капцюю т. Валошына проста ў твар міністра ўнутраных спраў.

Балбатня аб „раззбраеньні" і факты

Узбраеньні францускага імпэрыялізму

ПАРЫЖ. У апошнія тры гады, пачынаючы з эпохі лёндонскай морскай канфэрэнцыі, да пастаноў якое Францыя не далучылася, французкі імпэрыялізм ліхаманкава павялічваў свае морскія сілы, стараючыся нагнаць патрачаны ў першыя гады пасьля вайны час. У 1930 годзе на французкіх вэрфях былі закладзены і часткова спушчаны на ваду наступныя судны: адзін крэйсэр у 10.000 тон вадазьмяшчэньня, адзін крэйсэр — мінны заградзіцель у 5.880 тон вадазьмяшчэньня, 6 эскадронных мінаносцаў тыпу «Фантаск» вадазьмяшчэньнем у 2.500 тон і хуткасьцю ходу ў 37 вузлоў. 6 падводных лодак 1-ай клясы па 1.380 тон вадазьмяшчэньня, 4 падводных лодкі 2-ой клясы па 800 тон, 1 падводны мінны заградзіцель у 670 тон, 1 сеткавы заградзіцель у 2.300 тон, 3 авізо для калёніяльнай службы і 1 адзін крэйсэр свой ваенны флёт на Далёкім Усходзе.

Адначасова французкі ўрад узбройвае свае васалаў. Набудаваная ва Францыі падводная лодка «Лу» прыбыла ў польскі порт Гдыню. Цяпер зрыступлі да пабудовы 2-х контр-мінаносцаў і 1-го крэйсэра вадазьмяшчэньнем у 7.500 тон для Польшчы. Завод «Дэлёпе Дэльвіль» атрымаў заказ на 4 тыс. бомб даўжынёй у 1 мэтр для аэраплянаў, а завод «Брэгэ» — на 20 буксіраў для пралажтараў у 1 мэтр 20 сант. для Польшчы. 20 такіх жа буксіраў апраўлены ў Юга-Славію. Завод «Жовэле» атрымаў заказ для румынскай арміі па 25 млн. запальвачых і выбуховых патронаў для стральбы на танках і аэраплянах. (ТАСС).

Францыя ліхаманкава ўзбройвае сваіх васалаў

ПАРЫЖ, 14. Францыя ліхаманкава ўзбройвае сваіх васалаў. Праваенскія заводы **ў Марсэлі** выконваюць заказы на 6 тыс. газавых бомб. На заводзе «Дэлёпе Бэльвіль» у Парыжы заказаны 34 стаміліметравыя лафеты, 2 тыс. кручкоў для падводных лодак.

На заводзе палаўнічага рушынку «Жовэле» Ісі-Ле-Мулінэ (Парыжскі раён) галоўным чынам робяць кулі, рушынак для легкавога ўзбраеньня, гарматы, снарады, ракеты і скрынкі для кулямётаў. Гэты завод так перагружан заказамі, што ўступіў заводу Гочкіса заказ на **800 кулямётаў.** Аўтамабільны завод Рэно (Парыжскі раён) **кожную ноч сакрэтна сьвозіць танкі і аўта-кулямёты.** На гэтым заводзе робяць зараз 15 горных танкаў для вайсковага міністэрства і 20 танкетак **для паўскай паліцыі.** Аддзяленьне заводу, якое робіць знарадныя скрынкі, працуе ў 3 зьмены. У Брэсьце будуюць аэрадром і гідра-авіяцыйны порт. Францыя павялічыла на тры падводныя лодкі і адзін крэйсэр свой ваенны флёт на Далёкім Усходзе.

АБВЯШЧАЕЦЦА ПРЫЁМ АСЬПІРАНТАЎ

на вячэрні сэктар эканамічнага аддзяленьня Інстытуту Асьпірантуры БАН.

Прымаюцца члены і канд. КП(б)Б са стажам раб. на вытворчасьці або парт. і грамадзк. раб. на менш 3-х год. а таксама члены КСМ з камс. і вытворч. стажам на менш 3-х год. не старэй 35 год, якія маюць асьвету у абсягу ВНУ адпаведнай спэцыяльнасьці.

Заявы прымаюцца **да 18 студзеня.** Да заявы павінны быць прыкладзены:
1) Камандыроўка партыйных, або камсамольскіх органаў.
2) Засьведчаная анкета
3) Пасьведчаньне аб скончанай навучальнай установы.
4) Даведка аб стане здароўя.
5) Друкаваныя працы, калі такія ёсьць.
6) Даведка ўстановы, у якой працуе паступаючы ў Інстытут, аб адсутнасьці перашкод да паступленьня.

Праверачная канфэрэнцыя па дыямату, палітычнай эканоміі, гісторыі клясавай барацьбы, гісторыі партыі—адбудзецца памяж 15 і 20.

Слухачы вячэрн. сэктараў сумяшчаюць і інтэрнатам не забясьпечваюцца.

Заявы накіроўваць: **Менск, Інстытут Асьпірантуры БАН.**

Дырэктар Інстытуту Асьпірантуры **РЫЎЛІН.**

Кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

Ад 16-га студзеня, новы мастацкі гукавы гераічны фільм кіно Ленінградзкай ф-кі САЮЗКІНО

У гал. ролях: БАРЫС ШЛІХТЫНГ—афіцэр. ПЁТР САБАЛЕЎСКІ—салдат

СНАЙПЭР

Сцэнары і пастаноўка. Рэж. Г. Цімашэнка. Кампазытар—Н. Малех оўсні. Апэратар—В. Даніэльскі. Гук. апэратар—М. Мухаеў. Мастак — Е. ЭНЕЙ.

Дзеяньне адбываецца на франка-германскім фронце ў часе імтарыялістычнай войны.

ШТОДЗЕННА 5 сэансаў:
4-30, 6, 7-30, 9 і 10-30. Каса—ад 1 гадз.
Дзеці ў кіно не дапускаюцца. Пасьля 3 званка ўваход у залю закрыт.

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ Каса адкр. з 12 г. дня. Замежн. мас. фільм ПАСЫНКІ БЭРЛІНУ у гал. ролі Барнгардт Гэтчка.

ПРАЛЕТАРЫ Адкр. з 12 г. дня. Мастацкі замежны фільм ЧАЛАВЕК І ЛІЎРЭЯ у гал. ролі ЭМІЛЬ ЯНІНГС

КІНО „СПАРТАК" Пачатак сэансаў: 7 г. 9 г. 4 11 г. Каса—ад 5 г. Вядомы фільм НІБЕЛУНГІ ў 2-х серыях Дэманструецца. 1-я серыя ў 12 частках.

НАВУКОВАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ДАКТАРОЎ паведамляе, што Усесаюзны зьезд хірургаў, які скліканы на 25 студзеня 1932 году у гор. МАСКВЕ, ПЕРАНОСІЦЦА на 25 мая 1932 г.

Па даручэньні арг. кам. зьезду Навуковая Асацыяцыя дактароў.

УВАГА! НА БАРАЦЬБУ за 25.000 ТЫРАЖ! УВАГА!

Пасьпяшэйцеся з падпіскай на газэту „ТРЫБУНА РАДЗЕЦКА" на 1932 год.

Падпісвайцеся і распаўсюджвайце камуністычную польскую штодзённую газэту „Трыбуна Радзецка".

Чытачы, падпісныя, упаўнаважаныя, штурмавыя брыгады друку, карэспандэнты—распаўсюджвайце „Трыбуну Радзецку"!

Падпіску здавайце лістаносцам або ў бліжэйшыя рашткова-аддзяленьні **не позьней** 1 сакавіку, які вызначан **масцовым паштовым аддзяленьнем.** Атрыманая пазьней падпіска аўтаматычна на перанесіцца на наступны месяц.

Рабочыя, калгаснікі, адначасоўнікі! Падпісвайцеся своячасова на „Трыбуну Радзецку" на 1932 год!

„Трыбуна Радзецка" каштуе:

На 1 месяц	60 кап.	На 6 мес.	2 руб. 50 к.
„ 3 „	1 р. 50 кап.	„ 12 „	5 руб. —

БЕЛДЗЯРЖСЬПІРТУ патрэбен ТАРЫФАВЕД па чыгуначных перавозках. АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ.

ЦЭНТРАЛЬНЫМ майстэрням Менбуду ПАТРЭБНЫ: бухгальтар, рахункаводы, плянавік, зег. ТНБ, тэхнік-калькулятар. Аплата па згодзе. Зварачацца: Менск, Чырвонармейскі завулак, д. № 5, тэл. № 14-55.

Драмдзкавы і пятачны завод „Чырвоны Волак" ЗАПРАШАЕ на стałую працу 1 бухгальтара, 1 памочніка бухгальтара, 1 рахункавода. Аплата па згодзе. Магчыма на сваячоны рабочы дзень. Адрас: Ляхаў-а, вул. Варашылава, 16, тэл. 5-83.

Менск, друкарня газ. «ЗЬВЯЗДА»

Галеўлітбел № 337.